Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 ЛІСТАПАДА 2019 г. СЕРАДА № 212 (29079)

ДЗЕНЬ, ЯКІ ЗМЯНІЎ ХОД СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ

ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!

Віншую вас з Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Восень 1917 года кардынальна змяніла ход сусветнай гісторыі. Азнаменавала пачатак новай эры чалавечага развіцця, заснаванай на прынцыпах сацыяльнай роўнасці, справядлівасці і гуманізму.

Ідэалы рэвалюцыі сталі сімвалам адраджэння многіх народаў свету, узнялі іх на барацьбу за свабоду і раўнапраўе. Упершыню была створана беларуская дзяржава, якая рэалізавала законнае права нашага народа на самавызначэнне, развіццё самабытнай культуры, умацаванне нацыянальнага адзінства. Самаадданай працай мы пераўтварылі родны край. Здзейсніўшы ратны подзвіг, адстаялі незалежнасць краіны. Захаваўшы найлепшыя дасягненні савецкай эпохі, пабудавалі суверэнную дзяржаву.

Перакананы, што памяць пра гераічныя падзеі і выпрабаванні, што выпалі на долю беларусаў, узмацняе духоўную сувязь паміж пакаленнямі, выхоўвае пачуццё гонару за свой народ, умацоўвае згоду ў грамадстве, натхняе грамадзян на стваральныя ініцыятывы на карысць Радзімы.

У гэты святочны дзень жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту, нашай Беларусі — новых дасягненняў і працвітання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
А. Р. ЛУКАШЭНКА.

ЦЯГНІК ДАЛЕЙ ІДЗЕ

Фота БелТА.

У хуткім часе на другой лініі сталічнага метрапалітэна пачнуць курсіраваць сучасныя цягнікі беларускай вытворчасці. Зробленыя на прадпрыемстве «Штадлер-Мінск» саставы ўжо прыгналі ў дэпо на станцыі «Магілёўская», першы з іх ужо праехаўся да «Каменнай Горкі». Машыніст Павел КАРЧАГІН *(на фота)* новы лакаматыў ужо апрабаваў у дзеянні і цалкам ім задаволены.

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей РУМАС, прэм'ер-міністр:

«У цэлым сёлета забяспечаны рост эканомікі пры захаванні макраэканамічнай збалансаванасці. Інфляцыя ўтрымліваецца ў межах запланаваных значэнняў, сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі станоўчае — больш за $520 млн, стабільна працуе валютны і дэпазітны рынак. Чысты продаж валюты насельніцтвам склаў $638 млн, суб'ектамі гаспадарання — $719 млн. Працягваюць расці тэрміновыя рублёвыя дэпазіты насельніцтва. Рэспубліканскі бюджэт сёлета выконваецца, як і планавалася. Абавязацельствы ўрада ў замежнай валюце выкананы своечасова і ў поўным аб'ёме. Пры гэтым залатавалютныя рэзервы краіны з пачатку года павялічыліся на $2 млрд і на 1 лістапада склалі $9,2 млрд. Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ў студзені — жніўні выраслі на 6,8 %».

ISSN 1990 - 763X

Чвэрць 25 стагоддзя

Мікалай ШАРСНЁЎ:

«САПРАЎДНАЯ ЛЮБОЎ ДА РАДЗІМЫ ПАЧЫНАЕЦЦА З КЛОПАТУ ПРА ЯЕ»

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў у традыцыйнай рубрыцы «Звязды», прысвечанай развіццю краіны за 25 гадоў, адказаў на пытанні нашага ўласнага карэспандэнта.

СТАР. 4-5

Конкурс

З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ ТУРЫСТА

У Гродне пасля напружанай барацьбы вызначыліся з лагатыпам горада

Больш як паўгода грамадскасць абласнога цэнтра сачыла за тым, які з прапанаваных малюнкаў стане брэндам. Напачатку было прадстаўлена больш за 30 работ. У двух турах праз адкрытае галасаванне і прысуд журы вызначылася 11 фіналістаў. Пасля працяглых і гарачых «за» і «супраць» пераможцу ўсё ж такі назвалі.



Абарона ўсіх праектаў праходзіла даволі актыўна. У ліку аўтараў як асобныя дызайнеры, так і студыі. Галоўная ідэя — турыстычны брэнд павінен улічваць гістарычную аснову, але больш адпавядаць новым, сучасным тэндэнцыям. Вядома, быць зразумелым і пазітыўным.

— Мы павінны ўвасабляць у ім нашу мінуўшчыну, увесь культурны пласт, — выказаў свае разважанні **член журы, выкладчык ГрДУ імя Янкі Купалы Віталь КАРНЯЛЮК.** — З другога боку, лагатып павінен сведчыць аб тым, што ствараецца сённяшнім маладым пакаленнем, накіраваны ў будучыню і з'яўляецца нечым крэатыўным. Я аддаў перавагу выяве моста, які пракладвае шлях з мінулага ў будучыню.

СТАР. 3

СУМЕСНЫЯ ПРАЕКТЫ І АБМЕН ВОПЫТАМ

Падчас візіту ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Віцэ-прэзідэнтам, прэм'ер-міністрам і міністрам абароны ААЭ, правіцелем эмірата Дубай шэйхам Мухамедам бен Рашыдам аль-Мактумам. Пра гэта паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

На сустрэчы былі адзначаны высокі ўзровень палітычнага дыялогу паміж краінамі і рэгулярнасць кантактаў, інтэнсіўнае развіццё супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай і гуманітарнай сферах. Заяўлена аб гатоўнасці ўмацоўваць беларуска-эмірацкае супрацоўніцтва ва ўсіх галінах.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь зацікаўлена не толькі ў развіцці гандлёвых адносін, але і ў рэалізацыі сумесных праектаў і абмене вопытам. Суразмоўцы, у прыватнасці, абмеркавалі перспектыўныя праекты ў транспартна-лагістычнай, фінансавай сферах. Адзін з іх прадугледжвае стварэнне ў Мінску з дапамогай эмірацкага боку Міжнароднага фінансавага цэнтра. Цяпер завяршаецца распрацоўка канцэпцыі рэалізацыі гэтага праекта.

Ёсць вялікі патэнцыял і ў працягу інвестыцыйнага супрацоўніцтва, у тым ліку ў сферы сельскай гаспадаркі. У гэтым плане абмяркоўваецца магчымасць стварэння сумесных вытворчасцяў з наступнай рэалізацыяй сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання. ААЭ таксама цікавы беларускі вопыт развіцця сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Акрамя таго, размова ішла аб падрыхтоўцы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў да правядзення Сусветнай выстаўкі ЭКСПА-2020. І, у прыватнасці, пра ўдзел у ёй беларускага боку, з тым каб нацыянальны павільён Беларусі быў прадстаўлены ў найлепшым фармаце і спрацаваў з максімальнай аддачай.

Парламенцкі дзённік

ЖЫЦЬ ПА СРОДКАХ

Рост заробкаў бюджэтнікаў налета запланаваны на 10—11 працэнтаў

Упершыню за доўгі час бюджэт краіны на будучы год дэфіцытны амаль на адзін мільярд рублёў. Ды і даходы дастаткова сціплыя, але, нягледзячы на гэта, прыярытэтнай задачай вызначана развіццё сацыяльнай сферы. Пільная ўвага падчас работы над бюджэтам удзяляецца павышэнню заробкаў у дзяржаўным сектары. Галоўная задача ў 2020 годзе — забяспечыць узровень іх суаднясення з сярэднімі заробкамі ў эканоміцы ў памеры не менш за 80 %. Бюджэтныя асігнаванні на аплату працы складуць 4,6 мільярда рублёў.

У панядзелак у Палаце прадстаўнікоў правялі пашыранае пасяджэнне Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах, на якім абмеркавалі пытанні па бюджэце краіны 2020 года. А назаўтра дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі разглядалі галоўны фінансавы дакумент з **прэм'ер-міністрам Сяргеем РУМАСАМ** і іншымі прадстаўнікамі ўрада.

Сяргей Румас ацаніў бягучую эканамічную сітуацыю ў краіне як стабільную і кіраваную, з невялікім ростам.

Прынцыпамі бюджэту-2020, па словах прэм'ер-міністра, з'яўляюцца збалансаванасць, сацыяльная накіраванасць і формула жыцця па сродках.

З 1 студзеня мінімальны заробак, паводле плана ўрада, будзе складаць 375 рублёў — 100 % мінімальнага спажывецкага бюджэту. Адначасова вырашаецца задача павышэння аплаты працы настаўнікаў і ўрачоў.

Сярэдні заробак па эканоміцы налета складзе 1162 рублі. Па пенсіі таксама будуць прытрымлівацца суадносін 40 % ад сярэдняга заробку. «Грошы ў бюджэтах для гэтых мэт прадугледжаны», — падсумаваў Сяргей Румас.

Галоўная праблема эканомікі краіны — нізкі ўзровень прадукцыйнасці працы на прадпрыемствах дзяржсектара. Тут урад плануе, па-першае, дабіцца перавышэння тэмпаў росту прадукцыйнасці працы над тэмпамі росту заробкаў, па-другое, працаваць над аптымізацыяй страт.

Рост ВУП у будучым годзе не дазваляе выйсці на параметры пяцігодкі, але вырашаецца адна з ключавых яе задач — павышэнне дабрабыту насельніцтва.

Даходы бюджэту 2020 года сфарміраваны ў памеры 24,4 мільярда рублёў і прыраслі ўсяго на 0,3 %. Сюды ўключаны рост валавога ўнутранага прадукту на 1,9 %, стаўка рэфінансавання 9,5 %. Кошт нафты, закладзены ў дакумент, — 60 доларaў за бараль.

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людмілы ДАБРЫНІНАЙ,** у бюджэце ўлічаны страты ад даходаў пры рэалізацыі падатковага манеўру Расіі ў памеры каля 537 мільёнаў рублёў.

Асноўная крыніца даходнай часткі бюджэту — падаткі. Яны складаюць 81,2 % і на некалькі пунктаў прыраслі. «Застаюцца стаўкі падаткаў без змяненняў, але ў межах 530 мільёнаў рублёў ёсць дадатковыя даходы. Яны звязаны з гарманізацыяй заканадаўства ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза па акцызнай палітыцы. Таму ўзрастуць акцызы на моцныя алкагольныя напоі ў межах 6 %, на тытунёвыя вырабы — у межах 15 %», — патлумачыла Людміла Дабрыніна.

У даход пойдуць мытныя пошліны на ўвозныя нафтапрадукты і калійныя ўгнаенні — адпаведна 1,1 і 1,4 мільярда рублёў.

Расходы бюджэту запланаваны ў памеры 25,4 мільярда рублёў з ростам 11 % і інфляцыяй 5 %. На сацыяльную сферу выдаткуюць 5 мільярдаў (рост на 10 %), ахову здароўя — 1,3 мільярда рублёў (рост на 28 %). Гэтае павелічэнне забяспечыць рост заробкаў, набыццё сучаснага медыцынскага абсталявання і неабходных лекавых сродкаў.

«Вельмі важна адзначыць падтрымку шматдзетных сем'яў. 350 мільёнаў рублёў ужо накіравана на фарміраванне сямейнага капіталу. З 1 студзеня запрацуе механізм магчымасці выкарыстання яго датэрмінова. Як паказваюць сустрэчы, яго чакаюць шматдзетныя сем'і і падтрымліваюць палітыку дзяржавы ў гэтым плане. Гэта дапаможа вырашыць праблемы, звязаныя з паляпшэннем жыллёвых умоў, атрыманнем платнай адукацыі і медыцынскіх паслуг», — паведаміла старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў.

Адзначыла Людміла Дабрыніна закладзеную ў бюджэт падтрымку сельскай гаспадаркі, рэальнага сектара эканомікі. Па словах дэпутатаў, ёсць пэўная насцярожанасць, звязаная з дэфіцытам бюджэту, але аптымізму дадаюць магчымы эканамічны рост і павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнага сектара ў гэтым плане.

Марыя ДАДАЛКА.

Блізкая ўлада

ПРАБЛЕМЫ ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ І СІСТЭМНЫЯ

Вырашыць першыя і ўбачыць другія — такая місія заканадаўцаў падчас асабістага прыёму грамадзян. Пра гэта казаў і старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка, каментуючы вынікі сустрэчы звыбаршчыкамі ў Докшыцкім райвыканкаме.

На думку спікера, асабістыя прыёмы вельмі важны. «Трэба разумець, што ў нашай краіне гэта не разавыя акцыі, а сістэмная работа, выбудаваная на планавай аснове. Напрыклад, я раз у квартал у кожным раёне сваёй выбарчай акругі стараюся правесці такія сустрэчы з насельніцтвам. Яны шмат што даюць, — пераканаўся Уладзімір Андрэйчанка. — Мы вырашаем канкрэтныя пытанні людзей. Безумоўна, яны розныя, у тым ліку ёсць тыя, якія немагчыма адразу вырашыць. Тады ідуць пэўныя даручэнні райвыканкамам, дзесьці стараемся аказаць дапамогу ў іх вырашэнні. Сустракаюцца і пытанні, якія немагчыма вырашыць. Мы таксама аб гэтым гаворым».

Асобную ўвагу Уладзімір Андрэйчанка засяродзіў на двух найбольш важных, на яго погляд, момантах, звязаных з правядзеннем асабістых прыёмаў. «Першы: яны даюць магчымасць паглядзець, ці ёсць для гэтага рэгіёна нейкія сістэмныя пытанні, якія хвалююць усё насельніцтва. Ёсць разавыя (капрамонт і г. д.), мы стараемся іх вырашыць. Другі момант важны для нас як прадстаўнікоў заканадаўчай улады: суаднесці сваю работу з патрэбнасцямі людзей і выкарыстоўваць гэтыя напрацоўкі ў заканадаўчай дзейнасці», — падкрэсліў спікер.

Уладзімір Андрэйчанка звярнуў увагу, што ёсць пытанні сацыяльнай сферы, звязаныя са змяншэннем колькасці жыхароў у сельскай мясцовасці. «Гэта сістэмнае пытанне, на якое неабходна рэагаваць. Яно няпростае, патрабуе грошай, але яго трэба вырашаць», — пераканаўся ён.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што ў час рэалізацыі праграмы адраджэння вёскі ўдалося значна падцягнуць аграрадкі, там было пабудавана шмат жылля. Магчыма, трэба паглядзець, як жывуць і развіваюцца цяпер гэтыя населеныя пункты, выдзеліць найбольш перспектыўныя і зноў звярнуць на іх павышаную ўвагу, абнавіць іх сацыяльную базу, паглядзець рабочыя месцы.

«Некаторая нераўнамернасць ёсць у развіцці тэрытарый як сярод раёнаў, так і сярод абласцей. Вось гэтыя пытанні нам трэба разгледзець на ўзроўні краіны. Хутка будзе вярстацца праграма на наступную пяцігодку. Думаю, трэба на іх звярнуць асаблівую ўвагу», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Усяго на прыём да спікера ў Докшыцах звярнуліся тры заяўнікі. Адзін зварот быў звязаны з асабістым пытаннем, астатнія датычыліся працаўладкавання, вырашэння бытавых праблем. Першы зварот Уладзімір Андрэйчанка ўзяў на кантроль, вырашыць пытанні з астатнімі людзям дапамогуць мясцовыя ўлады.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама прыняў удзел у адкрыцці рэканструяванага харчаблока Докшыцкай цэнтральнай раённай бальніцы. На яго абнаўленне з мясцовага бюджэту было накіравана 700 тысяч рублёў.

Паводле БелТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Джонсан у выпадку перамогі на выбарах адразу ўнясе ў парламент здзелку аб Brexit

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Барыс Джонсан у выпадку перамогі на выбарах у снежні адразу ж унясе на разгляд парламента праект пагаднення з ЕС па Brexit. Такое абяцанне кіраўнік брытанскага ўрада і лідар кіруючай кансерватыўнай партыі зрабіў у лісце да старшыні апазіцыйнай лейбарысцкай партыі Джэрэмі Корбіна, паведамляе ТАСС.

Паводле слоў прэм'ера, у такім выпадку Брытанія пакіне Еўрапейскі саюз да канца студзеня 2020 года. Копію ліста Джонсан размясціў у Twitter.

Таксама ў гэтым лісце ён папрасіў Джэрэмі Корбіна даць адказ наконт пазіцыі лейбарыстаў адносна Brexit.

Урон сельскай гаспадарцы Японіі ад апошніх тайфунаў перавысіў $1,8 млрд

Урон сельскай і рыбалоўнай гаспадарцы Японіі ад тайфунаў «Факсай» і «Хагібіс» перавысіў $1,8 млрд, паведамляе агенцтва Kyodo.

Аднак, паводле інфармацыі міністэрства аховы навакольнага асяроддзя Японіі, гэтая лічба можа чарговы раз вырасці, таму што работы па ліквідацыі наступствaў удару стыхіі ўсё яшчэ працягваюцца.

Тайфуны абрынуліся на краіну ў верасні і кастрычніку. Так, ад «Хагібісу» пацярпелі 38 з 47 прэфектур Японіі. Зафіксавана 8,5 тысячы фактаў парушэння арашальных сістэм, пацярпелі таксама пасевы на плошчы 14 тысяч гектараў. Істотны ўрон нанесены рыбалоўным партам, прыбярэжным фабрыкам па перапрацоўцы морапрадуктаў. Ад паводак і абвалаў, выкліканых тайфунамі, загінула больш за 90 чалавек.

Трамп заявіў, што The New York Times прыпісала ўсе заслугі па ліквідацыі лідара ІД сабаку

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп паведаміў, што ў хуткім часе ў Белы дом прывядуць сабаку, якога выкарыстоўвалі ў аперацыі па ліквідацыі кіраўніка тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава» Абу Бакра аль-Багдадзі.

«Яны (The New York Times — **«Зв.»**) прадставілі аперацыю настолькі дрэнна, наколькі гэта магчыма. Я люблю сабак, але яны ўсе заслугі прыпісалі сабаку, — адзначыў Трамп, выступаючы ў панядзелак увечары на мітынгу перад прыхільнікамі ў штаце Кентукі. — Сабака заслугоўвае пахвалы і вельмі хутка прыйдзе ў Белы дом».

Раней Трамп апублікаваў фатаграфію жывёлы на сваёй старонцы ў Twitter. «Мы рассакрэцілі фатаграфію гэтага выдатнага сабакі (імя не рассакрэцілі), які прарабіў такую цудоўную работу пры высочванні і знішчэнні лідара ІД Абу Бакра аль-Багдадзі!» — напісаў Трамп.

Аб ліквідацыі верхавода ІД прэзідэнт ЗША аб'явіў 27 кастрычніка. Паводле яго слоў, аль-Багдадзі быў знішчаны ў ходзе спецаперацыі ў сірыйскай правінцыі Ідліб. Сусветная супольнасць назвала ліквідацыю завадатара ІД важным, але не вырашальным крокам, заклікаўшы працягнуць барацьбу з тэрарызмам.

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ!

Нягледзячы на вялікія выхадныя, традыцыя правядзення прамых тэлефонных ліній захаваецца. У суботу, 9 лістапада, з 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:

кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. (8 0162) 21 31 21);

намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. (8 0212) 22 22 22;

кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. (8 0232) 33 12 37;

кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. (8 0152) 73 56 44;

кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. (8 0222) 50 18 69;

намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017) 500 41 60;

першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. (8 017) 222 44 44.

Добрая навіна

НА ПЯРЭДНІМ РУБЯЖЫ

Пасля рэканструкцыі ўрачыста адкрылі пагранзаставу «Пясчатка»

Застава «Пясчатка» ў Камянецкім раёне, якая носіць імя Героя Савецкага Саюза Івана Барсукова, ахоўвае 13 кіламетраў Дзяржаўнай граніцы. Паводле слоў вайскоўцаў, сігналізацыя падае знак на пульт да дзесяці разоў за суткі. І кожны раз трывожная група выязджае на месца, каб упэўніцца, што на мяжы поўны парадак, а тэхніка спрацавала ад парыву ветру альбо неасцярожнага кроку лясной жывёліны. Але бываюць сігналы, якія сведчаць пра парушальніка Дзяржаўнай граніцы. Тады яго затрымаюць і даставяць на заставу.

Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Пра будні вартавых мяжы згадвалі шматлікія госці «Пясчаткі», якія прыбылі сюды на своеасаблівае навасе лле. Цэлы год вяліся работы па рэканструкцыі, рамонце, уладкаванні памяшканняў заставы і ваеннага гарадка. У казармах і дамах афіцэрскага складу пражывае каля паўсотні вайскоўцаў. Дзякуючы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі асабовы склад заставы атрымаў новую якасць жыцця і службы. Адрамантаваны будынак заставы з вучэбнымі класамі, казарма, а таксама дамы для сем'яў афіцэраў. Абноўлены ангар для тэхнікі, добраўпарадкавана тэрыторыя ваеннага гарадка.

Салдаты не без гонару паказвалі гасцям сваё жылое памяшканне з новенькай мэбляй, трэнажорную залу, вучэбныя класы. Адным словам, застава поўнасцю пераўтварылася, стала новай. **Старшыня ФПБ Міхаіл ОРДА** адзначыў ролю галіновых прафсаюзаў, раённага і абласнога аб'яднанняў, якія зрабілі свой унёсак у абнаўленне заставы і тым самым паспрыялі бяспецы краіны. А яшчэ прафсаюзны лідар падарыў вартавым мяжы чатырохногага памочніка — шчанюка ўсходнееўрапейскай аўчаркі. Ён падрасце і будзе заступаць у нарады разам з баявой групай.

Старшыня Дзяржпагранкамітэта краіны Анатоль ЛАПО выказаў удзячнасць органам мясцовай улады, грамадскім арганізацыям і прадпрыемствам, якія ўважліва ставяцца да патрэб вартавых мяжы, нярэдка аказваюць ім самую розную дапамогу. Кіраўнік памежнага ведамства адзначыў таксама, што работа па добраўпарадкаванні застаў у краіне будзе працягвацца.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС павіншаваў ваеннаслужачых з навасе леннем на старой заставе і падкрэсліў іх вялікую ролю ў захаванні бяспекі нашай краіны, бо яны стаяць на пярэдніх яе рубяжах.

Побач з заставай знаходзіцца памежны пераход «Пясчатка». Зараз праводзіцца вялікая работа па рэканструкцыі дарогі, якая вядзе на пераход. З яе ўводам у строй паток машын і людзей павялічыцца. Але для тых, хто захоча знайсці абходныя шляхі, вартавыя мяжы паабяцалі стварыць надзейны заслон.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Як будуць працаваць пошта, паліклінікі і бальніцы ў доўгія выхадныя?

Графік работы многіх установ памяняецца ў сувязі з лістападаўскімі выхаднымі і святамі.

У прэс-службе Міністэрства аховы здароўя паведамілі, як зменіцца графік работы ў арганізацыях аховы здароўя ў гэтыя доўгія выхадныя.

Так, бальнічныя арганізацыі 7 лістапада будуць працаваць па графіку святочнага дня, 8 лістапада — па графіку звычайнага рабочага дня, 9 і 16 лістапада — па графіку суботы, 10 лістапада — выхаднога дня.

Амбулаторна-паліклінічныя ўстановы, арганізацыі пералівання крыві, медыцынскай тэхнікі, аптэкі і іншыя 7 лістапада будуць працаваць па графіку святочнага дня, 8 і 9 лістапада — як у суботу, 10 лістапада — па графіку выхаднога дня, 16 лістапада — рабочага дня.

* * *

У РУП «Белпошта» расказалі пра рэжым работы аб'ектаў паштовай сувязі 7 лістапада 2019 года.

У прыватнасці, згодна з паведамленнем прэс-службы ведамства, 7 лістапада будуць функцыянаваць толькі дзяжурныя аб'екты паштовай сувязі.

Больш падрабязна аб рэжыме работы аб'ектаў паштовай сувязі можна даведацца ў кантакт-цэнтры РУП «Белпошта» па нумары 154 і па нумарах: (МТС) +375 33 3000 154, (А1) +375 44 5900 154.

Святлана БУСЬКО.

Напярэдадні падзеі

СТАРТ ДЛЯ ВЯЛІКІХ ПЕРАМОГ

З 8 да 10 лістапада на малой пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны» пройдзе Міжнародны турнір па хакеі з шайбай сярод юніёрскіх камандаў «Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба». У спаборніцтвах прымуць удзел зборныя Беларусі, Латвіі, Расіі і Славакіі.

Расклад турніру:
8 лістапада
13.00 Латвія — Расія;
16.15 Урачыстая цырымонія адкрыцця;
16.30 Славакія — Беларусь.
9 лістапада
13.00 Расія — Славакія;
16.30 Беларусь — Латвія.
10 лістапада
13.00 Славакія — Латвія;
16.30 Беларусь — Расія.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Музею маладзёжнага руху — рэканструкцыю

7 лістапада аб'ектам клопату актывістаў БРСМ стане Музей гісторыі камсамола і маладзёжнага руху Рэспублікі Беларусь, які размешчаны ў Рэспубліканскім доме моладзі ў Мінску.

Працоўны пачын «Труд — крут!» дасць старт работам па капітальным рамонце музея з абнаўленнем экспазіцыі, якія Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі плануе завяршыць да 100-годдзя камсамола Беларусі. Шчыраваць у гэты дзень будуць байцы зводнага студэнцкага будаўнічага атрада Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

7 лістапада дзверы Рэспубліканскага дома моладзі будуць адкрыты і для тых, хто пажадае папоўніць фонды музея. Перадаць рэліквіі ўдзелу ў маладзёжным руху са сваіх асабістых архіваў можна з 10.00 да 14.00 па адрасе: г. Мінск, вул. К. Маркса, 40, першы паверх.

Сяргей РАСОЛЬКА.

З нагоды

Будучыня — за ўніверсальнай журналістыкай

Сёлета факультэт журналістыкі БДУ адзначае 75 гадоў. Зараз ён — адзін з вядучых цэнтраў па падрыхтоўцы спецыялістаў у сферы масавых камунікацый. Навучанне тут праходзіць каля тысячы студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. Сярод запланаваных святочных мерапрыемстваў на наступныя некалькі месяцаў — розныя выстаўкі, навуковыя канферэнцыі, майстар-класы ад вядомых журналістаў.

Дэкан Вольга САМУСЕВІЧ расказала, што сёлета на факультэце адбылося шмат значных перамен у вучэбным працэсе:

— Летась мы зрабілі рэарганізацыю кафедраў — з дзесяці да сямі. З бягучага года вырашылі не праводзіць набор абітурыентаў на спецыяльнасць «Менеджмент». Сёлета конкурс на спецыяльнасць «Журналістыка. Вэб-журналістыка» аказаўся большым у некалькі разоў, чым на друкаваныя і аўдыявізуальныя СМІ. Таму можна гаварыць пра тое, што абітурыентаў вельмі цікавяць лічбавыя тэхналогіі. На сёння, каб быць запатрабаваным журналістам, трэба імкнуцца да ўніверсальнасці: рабіць матэрыялы ў друкаваныя СМІ, паралельна ствараць нешта для вэб-пляцоўкі, ведаць азы работы з відэа- і аўдыякантэнтам. Сядзець кожны дзень па пяць пар на факультэце для студэнтаў — учарашні дзень, навучанне павінна быць мабільнае, цікавае для іх. Таму летась мы пачалі выкарыстоўваць дыстанцыйныя тэхналогіі: выкладчыкі запісваюць свае лекцыі, змяшчаюць матэрыялы на спецыяльным сайце, а студэнты асвойваюць іх у любы час у камфортнай для сябе абстаноўцы.

У лістападзе на журфаку пройдзе «Студэнт на тыдзень». Гэты праект створаны для таго, каб школьнікі адчулі сябе сапраўднымі журналістамі і канчаткова вызначыліся з прафесіяй, упэўненая дэкан.

Сёлета на базе Белтэлерадыёкампаніі быў адкрыты філіял кафедры тэлебачання і радыёвяшчання факультэта журналістыкі — пляцоўка для вытворчай практыкі студэнтаў. Яшчэ адно новаўвядзенне — сумесная магістратура з эканамічным факультэтам БДУ па спецыяльнасці «Кіраванне медыяпраектамі». «Магчыма, у далейшым будзем узаемадзейнічаць і з іншымі факультэтамі ВНУ», — кажа Вольга Самусевіч.

Намеснік дэкана па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях факультэта Уладзімір СЦЯПАНАЎ адзначыў, што за апошні год на журфаку было абноўлена больш за 50 вучэбных праграм. З'явілася шмат новых сучасных дысцыплін, такіх як стварэнне і прасоўванне стартапаў, кіраванне сацыяльнымі медыя, прадзюсаванне ў аўдыявізуальных медыя.

— З улікам гэтага мадэрнізуецца і тэхніка. Напрыклад, летась на факультэце з'явілася 12 магутных камп'ютараў, якія дазваляюць займацца відэамантажом. Нашы супрацоўнікі праходзяць навучанне па кіраванні беспілотным апаратам, які мы закупілі, — заўважыў выступоўца. — Думаю, з наступнага навучальнага года ў нас з'явіцца паўнавартасная дысцыпліна для студэнтаў — робат-журналістыка, якая будзе прысвечана відэаздымкам з выкарыстаннем беспілотных апаратаў. Верагодней за ўсё, гэта будзе курс па выбары. Навучанне змогуць праходзіць студэнты розных спецыяльнасцяў.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ ТУРЫСТА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дарэчы, дызайн-студыя прапанавала адразу восем варыяцый на тэму мастоў. І сапраўды, асацыяцыя з мастамі быццам бы і да месца. Успомніць хоць бы старажытны мост, які вядзе да Старога замка. А яшчэ вядомы мост цераз Нёман, які можна ўбачыць на многіх панарамных здымках горада. Ёсць таксама чыгуначны мост, Румлёўскі, увогуле генеральны план горада прадугледжвае ў будучым наяўнасць ажно 11 мастоў.

Яшчэ адзін пасыл — да каралеўскага горада. Было прапанавана некалькі лагатыпаў з выявай кароны. І невыпадкова. Гродна было месцам многіх каралеўскіх рэзідэнцый. Менавіта такія лагатыпы набралі большасць галасоў у папярэднім туры.

— Мне падабаецца брэнд каралеўскага горада, — гаворыць вядомы **гродзенскі мастак Аляксандр СІЛЬВАНОВІЧ.** — Але ёсць пэўныя заўвагі. Напрыклад, кароль на адным з лагатыпаў атрымаўся падобны на Нептуна. Яшчэ адзін, на мой погляд, яркі брэнд з мноствам сімвалаў, дзе вялікую сэнсавую нагрузку нясе сам шрыфт. Можна было б яшчэ папрацаваць над канчатковым выглядам лагатыпа, падключыць сталічных дызайнераў...

Трэба сказаць, што ўдзельнікамі конкурсу ў пераважнай большасці сталі гродзенцы. Многія з іх лічаць падзею вельмі значнай для горада, бо яна настройвае на пазітыў. У той жа час сімвал — свайго роду маркетынгавы ход.

— З'явілася моладзь, якая ўмее даносіць і адстойваць свае пазіцыі і бачанне. Вельмі цікавая каляровая гама, матывы Каложскай царквы, гэта добры турыстычны матыў, — падкрэсліў **член журы, кіраўнік шэрагу трансгранічных праектаў Сяргей КАЛЯДА.**

Некалькі аўтараў увасобілі ў сваіх работах выяву аленя, і гэта выклікала нямала спрэчак.

— Паколькі брэнд горада — гэта цэлая філасофія, яна ў нейкай ступені адлюстроўвае гарадскую геральдыку, але разам з тым робіць крок у перспектыву, — заўважае **гродзенскі гісторык Андрэй ВАШКЕВІЧ.** — Я лічу, што ў нас яшчэ не вельмі выкарыстаны патэнцыял гарадской сімволікі, у тым ліку алень святога Губерта.

Паколькі выява аленя — адна з самых адметных для горада, яна і стала пераможцай конкурсу. І, як ні парадаксальна, аўтары гэтай работы не гродзенцы, а дызайнеры з Брэста.

— Можа здацца, што алень з герба — гэта банальна, але ў горада ёсць моцны сімвал, які мае прыгожую легенду, і ён можа працаваць, — тлумачыць сваю пазіцыю **брастаўчанін Уладзімір Платоненка.** — Мы распрацавалі брэнд менавіта турыстычнага Гродна, а алень з герба — самы пазнавальны вобраз. За аснову мы ўзялі сіні колер герба, дапоўнілі колерам плінфаў Каложы, і атрымаўся фірменны арнамент горада. Мы бачым брэнд з пазіцыі турыстаў, якімі самі тут і з'яўляемся.

Аўтары зрабілі лагатып гібкім у адносінах да родных мерапрыемстваў — напрыклад, з улікам музыкі, тэатра, грамадскага харчавання. Усе яны выкананы ў аднолькавай стылістыцы. Менавіта такі комплексны падыход дадаў плюсоў лагатыпу, які атрымае далейшае жыццё ў рэкламнай прадукцыі, архітэктуры горада, на транспарце. Зараз вядзецца работа над слоганам да лагатыпа.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

«САПРАЎДНАЯ ЛЮБОЎ ДА РАДЗІМЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Мікалай Мікалаевіч, сацыяльна-эканамічнае развіццё — гэта той фундамент, на якім грунтуецца дабрабыт любой тэрыторыі. Узровень жыцця вобласці — гэта поспех кожнага прадпрыемства, кожнай арганізацыі, кожнага работніка. Як бы вы ахарактарызавалі асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна?

— Лічу, што Віцебшчына годна развіваецца ва ўсіх кірунках: ад эканомікі да сацыяльнай абароны. Рэгіён, маючы 11,3 % колькасці занятага ў эканоміцы насельніцтва краіны, фарміруе 14,2 % аб'ёму прамысловай вытворчасці краіны. Удзел вобласці ў эканоміцы Беларусі нядрэнны: 11,9 % — прадукцыя сельскай гаспадаркі, па 10,8 % — выручка ад рэалізацыі прадукцыі (тавараў, работ, паслуг) і рознічны тавараабарот, 9,1 % — інвестыцыі ў асноўны капітал і ў цэлым валавы рэгіянальны прадукт — 7,5 %.

На Віцебшчыне вырабляюць 100 % ільняных тканін, даламітавай мукі, каля 90 % дываноў і дывановых вырабаў, палімераў этылену, труб дрэнажных, палову рэспубліканскага аб'ёму абутку...

— Віцебшчына — самы паўночны рэгіён краіны, адзін з найбуйнейшых па плошчы, з самай вялікай у краіне колькасцю населеных пунктаў, аддаленых адзін ад аднаго і ад адміністрацыйных цэнтраў. Як у такіх умовах вырашаюцца праблемы жыццезабеспячэння людзей, выконваюцца дзяржаўныя стандарты?

— Што датычыцца сацыяльнага абслугоўвання, адпаведныя стандарты тут укаранёныя цалкам. Напрыклад, сацыяльныя паслугі грамадзянам і сем'ям, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, аказваюць 25 тэрытарыяльных цэнтраў, у якіх функцыянуюць 153 аддзяленні. Аказваецца дапамога непрацаздольным грамадзянам, а таксама паслугі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў.

Паспяхова ўкараняюцца новыя, эканамічна выгадныя формы жыццеўладкавання пажылых грамадзян. Пастаянна пашыраецца спектр сацыяльных паслуг. Напрыклад, арганізавана работа 11 сацыяльных цырульняў, 13 пральняў, абутковай майстэрні для непрацаздольных, малазабяспечаных. Арганізавана работа 434 гурткоў і клубаў па інтарэсах, 84 працоўных майстэрняў для асоб з інваліднасцю, якія аснашчаны неабходным абсталяваннем, прыстасаваннямі, інвентаром і расходнымі матэрыяламі — гэта спрыяе іх сацыяльна-бытавой адаптацыі, выяўленню і развіццю творчых і працоўных навыкаў.

— Мікалай Мікалаевіч, у адным з інтэрв'ю вы казалі, што галоўная задача кіраўнікоў раёнаў і арганізацый вобласці — зрабіць жыццё вяскоўцаў не горшым, чым у гараджан. Сапраўды, знешні выгляд беларускай вёскі мяняецца ў лепшы бок. Але ці дастаткова гэтага, каб моладзь заставалася ў сельскай мясцовасці? Як прыцягнуць у вёску высокакваліфікаваныя кадры?

— Наконт маладых кадраў на сяле, ва ўзросце да 31 года: іх прыкладна 25 працэнтаў ад агульнай колькасці ў сельскагаспадарчых арганізацыях вобласці. Работа з маладымі спецыялістамі, якія прыходзяць у АПК Віцебскай вобласці, — наш прыярытэтны кірунак. Скажу, што тэндэнцыя найбольшага размеркавання на малую радзіму, а пасля і пражывання з бацькамі захоўваецца ў нас з 2011 года...

Сёння, калі рынак працы дыктуе новыя колькасныя і якасныя патрабаванні да сучаснага спецыяліста і работніка, прынцыпова новае аблічча павінна набыць і сістэма падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў. Яна павінна быць індывідуальнай — пад канкрэтную вытворчасць. Адным з прыкладаў такога падыходу з'яўляецца ўзаемадзеянне ўстаноў прафтэхадукацыі з абласным камітэтам па сельскай гаспадарцы і харчаванні па арганізацыі вытворчай практыкі на базе найлепшых гаспадарак. Распрацавана новая вучэбная дакументацыя, тэрміны практыкі павялічаны ў два разы...

Я глыбока перакананы, што ў рабоце з кадрамі дробязяў не бывае. Толькі комплексна вырашаючы пытанні доўгатэрміновага аб'ектыўнага прагнозу неабходнасці ў кадрах, сістэмна, загадзя рыхтуючы кадры рабочых і асабліва спецыялістаў для новых інавацыйных вытворчасцяў, аператыўна задавальняючы патрэбы арганізацый у кадрах праз сістэму дадатковай адукацыі і мэтавую падрыхтоўку, ствараючы ўмовы для маладога спецыяліста, мы павысім кадравы патэнцыял рэгіёна. Менавіта ў гэтым кірунку і сканцэнтраваны нашы намаганні.

— Актуальнай задачай застаецца падтрымка развіцця прыватнай ініцыятывы. Пашырэнне прадпрымальніцкага сектара — адзін з найважнейшых індыкатараў рэгіянальнага развіцця. Але ці ўсе рэзервы тут задзейнічаны? Як абудзіць у патэнцыйных бізнесменаў «прадпрымальніцкую жылку»? Наколькі падпісаны Прэзідэнтам Дэкрэт «Аб развіцці прадпрымальніцтва» пасадзейнічаў разняволенню дзелавой ініцыятывы?

— У недзяржаўным сектары эканомікі заняты каля 30 % эканамічна актыўнага насельніцтва вобласці, ён забяспечвае траціну інвестыцый у асноўны капітал, чацвёртую частку бюджэту, больш за палову экспарту тавараў і экспарту паслуг.

Узровень прадпрымальніцкай актыўнасці і, як следства, рост укладу гэтага сектара ў развіццё рэгіёна, залежыць у тым ліку і ад крэдытна-інвестыцыйнай падтрымкі, якая аказваецца бізнесу банкамі.

Да цяперашняга часу атрыманне крэдыту стрымлівала ўмова: заклад маёмасці. Але сёлета ў рамках дзяржпраграмы падтрымкі прадпрымальніцтва на базе фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў створаны гарантыйны фонд, які дае паручыцельства малому бізнесу па банкаўскіх крэдытах і лізінгах. І гэта паручыцельства пакрывае да 60 % запазычанасці па крэдытнай дамове альбо кантрактнага кошту па дамове лізінгу.

Гэта не толькі палегчыць атрыманне суб'ектамі малога бізнесу пазыковых рэсурсаў, але і стане штуршком для рэалізацыі іх прадпрымальніцкай ініцыятывы, будзе спрыяць павышэнню канкурэнтаздольнасці на рынку, паляпшэнню інвестыцыйнага клімату, а таксама дасць дадатковыя магчымасці для развіцця бізнесу.

— У Мёрскім раёне плануецца распачаць вытворчасць белай бляхі. Памер інвестыцый — да 460 мільёнаў рублёў. Якія яшчэ сур'ёзныя інвестыцыі прыцягнуты ў вобласць або плануецца іх прыцягненне ў найбліжэйшы час?

— За дзевяць месяцаў бягучага года ў эканоміку Віцебскай вобласці прыцягнута 1733,6 мільёна рублёў інвестыцый у асноўны капітал, або 104,6 працэнта да адпаведнага перыяду 2018 года ў супастаўных цэнах.

З мэтай актывізацыі знешнеэканамічнай дзейнасці, пошуку стратэгічных інвестараў і новых інвестыцыйных праектаў у 2019 годзе праводзяцца пастаянныя міжнародныя мерапрыемствы (форумы, выстаўкі, прэзентацыі), перамовы, візіты замежных дэлегацый. У адкрытым доступе на сайтах гаррайвыканкамаў прадстаўлены прапановы інвестарам, а таксама зямельныя ўчасткі для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. На тэрыторыі СЭЗ «Віцебск» маецца каля 500 гектараў свабодных зямельных участкаў, прызначаных пад новае будаўніцтва.

Фота БелТА.

ААТ «Нафтан».

Цяпер з удзелам літоўскага інвестара — кампаніі ТАА «ВМГ ВудАрт» рэалізуецца інвестыцыйны праект па стварэнні вертыкальна інтэграванага дрэваапрацоўчага комплексу (аб'ём інвестыцый каля 25 мільёнаў долараў ЗША); эстонскім інвестарам — кампаніяй ТАА «Акітама» рэалізуецца праект па будаўніцтве завода па перапрацоўцы нізкатаварнай драўніны, выпуску драўняна-паліўных гранул і дробных драўняных кампанентаў (інвестыцыі складаюць больш за 30 мільёнаў рублёў).

Да канца гэтага года будзе ўведзены ў эксплуатацыю завод па вытворчасці балонаў высокага ціску ў Оршы з удзелам чэшскага капіталу (аб'ём інвестыцый каля дзевяці мільёнаў еўра).

Шэраг інвестыцыйных праектаў знаходзіцца цяпер у стадыі прапрацоўкі. Так, кітайская кампанія «Блэк Кэт Карбон» зацікаўлена ў рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па вытворчасці тэхнічнага вугляроду з інвеставаннем.

У Віцебску прапрацоўваецца магчымасць рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па гарачым цынкаванні металу. Зацікаўленасць у рэалізацыі праекта праявіла аўстралійская кампанія «Патэл груп».

— Мікалай Мікалаевіч, дарэчы, вы ўвайшлі ў рабочую групу, якая будзе кантраляваць выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы па горадзе Оршы. Што сёння ў першую чаргу на парадку дня? Якія праблемы ўжо вырашаны?

— Прынятыя кіраўніком дзяржавы і ўрадам нарматыўныя прававыя акты па Аршанскім раёне надалі новы імпульс развіццю гэтага рэгіёна па ўсіх кірунках.

Для забеспячэння ўстойлівага руху наперад створаны ўсе перадумовы.

Падпісаны Указ № 506, зацверджаны комплекс мер па рэалізацыі Праграмы развіцця Аршанскага раёна на перыяд да 2023 года і план развіцця Аршанскага раёна на 2019 год.

За студзень — верасень вышэй за сярэднеабласны ўзровень паказчыкі па вытворчасці прадукцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, рэнтабельнасці продажаў, тэмпы росту інвестыцый у асноўны капітал, будаўніча-мантажных работ, тавараабароту грамадскага харчавання.

Завершана рэканструкцыя часткі будынка аператыўнага корпуса і часткі будынка сіласнага корпуса пад размяшчэнне лініі экструзіі паўнатлустай соі на тэрыторыі ЗАТ «Экамол-Агра», запушчаны цэх па вытворчасці замарожаных агародніны і ягад у філіяле «Цяплічны». Пачалі дзейнасць 47 новых прадпрыемстваў. А гэта новыя рабочыя месцы, павелічэнне паступленняў у бюджэт для вырашэння сацыяльных праблем.

Вядуцца работы па будаўніцтве шэрагу аб'ектаў аграпрамысловага комплексу, пад'язной аўтамабільнай дарогі рэспубліканскага значэння, аэрадрома Орша з капітальным рамонтам існуючай узлётна-пасадачнай паласы, уключэнню ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца.

Вялікая ўвага аддаецца навядзенню парадку на тэрыторыі горада і раёна. На вуліцах і дварах з'явіліся новыя малыя архітэктурныя формы, працягваецца азеляненне тэрыторый.

— Дарэчы, у Аршанскім раёне знаходзіцца адзін з чатырох аграхолдынгаў. Вы былі ініцыятарам іх стварэння, у гэтым пытанні Віцебшчына — першапраходзец. Наколькі паспяхова яны функцыянуюць?

— Сёння інтэграцыйныя структуры — ядро аграпрамысловага комплексу, у якіх працуе больш за 40 працэнтаў занятых у сельскай гаспадарцы.

За тры гады рэалізацыі Указа Прэзідэнта «Аб развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці Віцебскай вобласці», у рамках якога створаны інтэграцыйныя структуры на базе перапрацоўчых прадпрыемстваў ААТ «Віцебскі мясакамбінат», «Глыбоцкі камбікормавы завод», «Аршанскі камбінат хлебапрадуктаў», «Полацкі камбінат хлебапрадуктаў», атрымалася дасягнуць пэўных вынікаў. За 2016—2018 гады прадпрыемствы інтэграцыйных структур павялічылі валавую прадукцыю сельскай гаспадаркі на 20 %, вытворчасць малака — на 11,4 %, вырошчванне буйной рагатай жывёлы — на 23,1 %, свіней — на 56,8 %.

Падчас рэалізацыі ўказа на ўзроўні названых структур былі створаныя ўмовы для цэнтралізацыі закупак высокапрадукцыйнай тэхнікі, мінеральных угнаенняў, сродкаў абароны раслін і правядзення сельскагаспадарчых работ у больш аптымальныя агратэхнічныя тэрміны.

Таксама быў створаны цэнтралізаваны фонд падтрымкі і развіцця аграпрамысловай вытворчасці Віцебскай вобласці.

Закуплена ўсяго 1365 адзінак сучаснай высокапрадукцыйнай тэхнікі, пабудавана, адрамантавана і рэканструявана 294 сянажныя траншэі, рэканструявана, адрамантавана 66 малочнатаварных фермаў і 15 комплексаў па вырошчванні буйной рагатай жывёлы і свіней.

На базе прадпрыемстваў-інтэгратараў і буйных перапрацоўшчыкаў створаны цэнтралізаваныя службы ветэрынарыі, мехатрады, будаўнічыя службы, паслугамі якіх могуць карыстацца ўсе арганізацыі і філіялы, што ўваходзяць у структуру.

ПАЧЫНАЕЦЦА З КЛОПАТУ ПРА ЯЕ»

Акрамя таго, каб не страціць сыравіну для загрузкі перапрацоўчых прадпрыемстваў і забяспечыць своечасовае правядзенне палявых работ, у 2017—2018 гадах у даверанае кіраванне інтэграцыйным структурам перададзена каля 100 сельскагаспадарчых арганізацый, якія не маглі самастойна займацца вытворча-гаспадарчай дзейнасцю, а таксама землі і актывы прадпрыемстваў-банкрутаў. На дапамогу гэтым гаспадаркам прыйшлі механізаваныя атрады, што дазволіла летась дадаткова разараць і ўцягнуць у севазварот 15 тысяч гектараў раллі, закінутай у выніку ліквідацыі (банкруцтва) сельскагаспадарчых арганізацый. Гаспадаркі былі забяспечаны кармамі, ГЗМ, насеннем, асноўнымі гербіцыдамі для праполкі пасеваў збожжавых культур, кукурузы, рапсу.

У выніку ў недалучаных сельскагаспадарчых арганізацыях выручка ад рэалізацыі прадукцыі ўзрасла ў 2,2 раза да ўзроўню 2015 года, што дазволіла атрымаць пяць мільёнаў рублёў чыстага прыбытку супраць страты 4,6 мільёна рублёў у 2015 годзе, а таксама павялічыць узровень сяроднямесячнай заработнай платы.

— Між іншым, у Віцебску ў 2020 годзе плануецца правядзенне «Дажынак». Наколькі правядзенне гэтага свята ўплывае на знешні выгляд райцэнтраў і іншых населеных пунктаў?

— Падчас падрыхтоўкі да фестывалю «Дажынкі» ствараецца больш выразнае аблічча райцэнтраў. Дзякуючы пераўтварэнням яны набываюць рысы сучаснага горада. Шмат робіцца для таго, каб людзі мелі годную інфраструктуру.

Штогод каля дзвюх сотняў аб'ектаў атрымліваюць другое нараджэнне ў дажыначных сталіцах. Новыя абліччы набываюць вуліцы райцэнтраў. Больш прывабнасці населеным пунктам дадаюць арыгінальныя кветкавыя кампазіцыі. Прыкметна паляпшаецца якасць вулічна-дарожнай сеткі. Сваю лепту ў навядзенне парадку ўносяць жыхары, упрыгожваючы прыдамавыя тэрыторыі.

Пасля заканчэння свята абнаўленне працягваецца. Дарэчы, мы штогод у абавязковым парадку кардынальна ўладкоўваем па два пасёлкі вобласці ў дадатак да горада, які будзе прымаць эстафету свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі».

Так, раўняючыся на аграгарадок Копысь, пераўтварэнні закранулі таксама пасёлкі Балбасава Аршанскага і Езярышча Гарадоцкага раёнаў, дзе працягваюцца работы, пачатыя летась. У цэнтры ўвагі Бягомль Докшыцкага і Багушэўск Сенненскага раёнаў. Гэтыя населеныя пункты не павінны быць тэрыторыямі кантрастаў. Калі наводзіць парадак, то ва ўсім: ад прыдамавых участкаў і цэнтральных вуліц да арганізацый. Усё атрымаецца, калі работа будзе весціся не толькі сіламі мясцовай улады. Самі жыхары не павінны заставацца ўбаку ў справе падтрымання парадку. Гэта ж робіцца для сябе, для падрастаючага пакалення. Ды і ў цэлым, каб кожнаму стала прыемней жыць, працаваць і адпачываць.

— Віцебшчыну даўно асацыююць з традыцыямі высокай культуры, у свеце ведаюць яе шырокамаштабныя фестывальныя праекты — «Славянскі базар», «Званы Сафіі», «Браслаўскія зарніцы» і іншыя. У такія дні рэгіён наведвае шмат турыстаў. А што ў астатні час? У якім кірунку трэба развіваць турыстычную галіну?

— Віцебская вобласць мае значны патэнцыял развіцця турызму — пазнавальнага, экалагічнага, аздараўленчага, сельскага, паломніцкага, транзітнага. Назапашаная стагоддзямі культурна-гістарычная спадчына ўяўляе міжнародны інтарэс, а размешчаныя на тэрыторыі рэгіёна экалагічныя сістэмы і прыродныя ландшафты ўнікальныя.

У параўнанні з 2015 годам колькасць арганізаваных турыстаў і экскурсантаў, якія наведалі Віцебскую вобласць, павялічылася з 25,6 тысячы чалавек да 37,6 тысячы, ці ў 1,5 раза, колькасць прынятых турыстаў суб'ектамі аграэкатурызму выросла з 32,2 тысячы да 42,1 тысячы чалавек, ці ў 1,3 раза. Выручка ад аказання турыстычных паслуг арганізацый, якія ажыццяўляюць турыстычную дзейнасць, павялічылася ў 1,8 раза. Наша вобласць — адзіная ў краіне, дзе ў кожным раёне (горадзе) дзейнічае турысцка-інфармацыйны цэнтр.

Падчас «Дажынак-2019» у Браславе.

www.sb.by

Адзін з прыярытэтных кірункаў турыстычнай дзейнасці — аграэкатурызм, тая сфера, у якой аб'ядноўваюцца намаганні як эканамічнага, так і неэканамічнага характару, як міжнароднага, так і нацыянальнага ўзроўня.

Прамысловы турызм, або арганізацыя турыстычных экскурсій на дзеючыя вытворчасці, у Віцебскай вобласці знаходзіцца ў пачатку шляху развіцця, аднак мае значны патэнцыял. Развіццё прамысловага турызму, спадзяюся, таксама паслужыць дадатковай рэкламай прамрадукцыі, будзе спрыяць яе збыту, далейшаму эканамічнаму росту прадпрыемстваў.

Тэатральны турызм толькі пачынае развіццё. Так, 25—26 лістапада 2017 года ў Полацку прайшоў прэс-тур для рэспубліканскіх і мясцовых сродкаў масавай інфармацыі ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Падтрымка ўстойлівага развіцця турызму ў Беларусі», дзе адбылася прэзентацыя новых турыстычных прадуктаў «Полацк Тэатральны»: пастаноўка спектакля аб Францыску Скарыну (тэатра гістарычнага касцюма «Полацкі звяз») і пастаноўка спектакля «Легенда аб Усяславе Полацкім» у камерным выглядзе (заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь тэатра «Пілігрым»).

Вобласць стала першапраходцам у развіцці гэтага віду турызму!

Віцебшчына — адзіная ў Беларусі, якая ўключана ў Еўрапейскую сетку кулінарнай спадчыны. І наша краіна прадстаўлена пяццю раёнамі вобласці: Мёрскім, Верхнядзвінскім, Глыбоцкім, Полацкім і Лепельскім. Тут засяроджана больш за 30 аб'ектаў грамадскага харчавання, якія прапануюць унікальныя стравы з мясцовых прадуктаў.

Усё больш папулярным кірункам уязнога турызму становіцца педагагічны турызм, што знаходзіцца на скрыжаванні такіх сфер, як педагогіка, турызм, адукацыйны менеджмент. Усё большая колькасць педагогаў карыстаецца магчымасцю злучыць падарожжа з навучаннем і павышэннем кваліфікацыі. На базе ўстаноў адукацыі Віцебскай вобласці арганізуюцца семінары-практыкумы па абмене вопытам работы для педагогаў устаноў адукацыі Расійскай Федэрацыі.

Таксама і медыцынскі турызм з кожным годам становіцца ўсё больш запатрабаваны і папулярны сярод замежных грамадзян.

Варта адзначыць, што па выніках 2017 і 2018 гадоў турыстычныя прадпрыемствы Віцебскай вобласці занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару ў намінацыі «Арганізацыі, якія ажыццяўляюць турыстычную дзейнасць» (выбіраецца толькі адно прадпрыемства з усёй краіны).

— Мікалай Мікалаевіч, працягваецца «трылогія» Года малой радзімы. На сустрэчы з журналістамі ў дзень іх прафесійнага свята вы таксама згадвалі родныя мясціны... Прыемна, калі бізнесмены, палітыкі, творчыя дзеячы клапоцяцца пра свой «родны кут». Ці шмат такіх прыкладаў на Віцебшчыне?

— Аб'яўленне Года малой радзімы падштурхнула больш пільна прыгледзецца да праблем маленькіх вёсак, невялікіх пасёлкаў, іх добраўпарадкавання. Упэўнены, сапраўдная любоў да Радзімы пачынаецца з клопату пра яе.

Цяжка пералічыць усе мерапрыемствы, прысвечаныя Году малой радзімы. Нават калі коратка напісаць пра кожнае, думаю, не хопіць і цэлага нумара газеты. І ўсё больш прыкладаў, калі нераўнадушныя людзі ажыццяўляюць рэальныя справы. Заснавальнік турыстычнага комплексу «Чырвоны Бор» Наваполацкага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Інтэрсэрвіс» Мікалай Верабей адзін з, можна сказаць і так, актывістаў. Ён уносіць значны ўклад у развіццё Верхнядзвінскага раёна, дапамагае ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыяльнай сферы. Прымае актыўны ўдзел у пытаннях навядзення парадку на зямлі, добраўпарадкавання сельскіх тэрыторый, паляпшэння інфраструктуры гарпасёлка Асвея. Выклікаюць павагу і падзяку яго намаганні па ўвекавечанні памяці ахвяр Вялікай Айчыннай, дапамозе ў рэканструкцыі домаўладанняў грамадзян, будаўніцтве дарог, культавых аб'ектаў.

За асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Верхнядзвінскага раёна, актыўную грамадзянскую пазіцыю Мікалай Верабей удастоены ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны — 2015».

У новым цэху па вытворчасці замарожаных агародніны і ягад філіялу «Цяплічны» РУП «Віцебскэнерга».

Фота БелТА.

Максім Калінін, дырэктар і заснавальнік прадпрыемства «Калінпрадукт», дэпутат Новалукомльскага гарадскога Савета дэпутатаў, для якаснага адпачынку з дзецьмі на базе старога кінатэатра ў Новалукомлі стварыў забаўляльны цэнтр «Электрон». Гэта комплекс з рознымі забаўляльнымі пляцоўкамі і кафэ, якое абсталявана пры ўдзеле супрацоўнікаў МНС спецыяльна для навучання дзяцей асновам бяспечнай жыццядзейнасці. Аддае Максім Калінін вялікую ўвагу прапагандзе здаровага ладу жыцця і развіццю спорту ў рэгіёне. Дзякуючы яму ў Новалукомлі з'явіліся фітнес-зала, адкрытая трэніровачная пляцоўка для заняткаў спортам. Арганізоўвае ён і міжнародныя турніры па міні-футболе для дзяцей з удзелам камандаў Чашніцкага раёна. Аказвае дабрачынную дапамогу ў аднаўленні і рамонце храмаў, размешчаных на тэрыторыі раёна.

Упэўнены, яшчэ будзе шмат навін і асоб, каб ганарыцца тым, што робіцца ў рамках Года малой радзімы.

— І апошняе пытанне. Чым асабіста вам запомнілася гэта апошняя чвэрць стагоддзя? Чым парадавала ці, можа, засмуціла?

— Радуе, што за 25 гадоў наша краіна ўдала пераадолела выпрабаванні пасля знікнення з карты свету СССР. Няпростая сітуацыя склалася ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы і іншых сферах. У самыя кароткія тэрміны неабходна было вырашыць праблемы ўздыму эканомікі, не забываючы галоўнага — паляпшэння якасці жыцця грамадзян і павышэння іх дабрабыту. І кіраўніцтву краіны, вобласці ўдалося ў аптымальныя тэрміны справіцца з пастаўленай задачай.

Зараз стабільна забяспечваецца станоўчая дынаміка развіцця асноўных галін эканомікі. Як незалежная дзяржава Беларусь упэўнена развіваецца і насамрэч з'яўляецца краінай для годнага жыцця. Шчыра радуюся, калі бываю на сваёй малой радзіме — на Аршаншчыне, і прыемна, калі людзі кажуць дзякуй уладзе за тое, што зроблена. Населеныя пункты дагледжаныя, у людзей ёсць магчымасць працаваць, жыць у сваім жыллі, мець дапаможную гаспадарку. Усё больш вёсак, якія не горшыя для жыцця, чым райцэнтры...

Беларусы не прывыклі сумаваць. Усе цяжкасці, праблемы можна пераадолець, калі ёсць сістэмныя падыходы ў іх вырашэнні, калі добрасумленна працаваць, дакладна паставіўшы сабе канкрэтныя мэты. Упэўнены, усё ў нас атрымаецца, і Віцебшчына вельмі годна будзе і надалей працаваць на дабрабыт усёй краіны.

Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 10 декабря 2019 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже одним лотом имущества участка по производству керамзита завода КПД, расположенного по адресу: Гомельская обл., Петриковский р-н, Муляровский с/с, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Гомельский домостроительный комбинат» на праве собственности

Состав лота № 1:
Здания, сооружения и передаточные устройства:
Здание печного цеха, одноэтажное, кирпичное, металлопрофильное, инв. № 335/С-46956 (Муляровский с/с, 9). Одноэтажное здание, год постройки 1978. Общая площадь 2321,8 кв. м. Составные части и принадлежности: труба
Массоподготовительное отделение с запасником, инв. № 335/С-46937 (Муляровский с/с, 9/5). Одноэтажное панельно-кирпичное здание, год постройки 1993. Общая площадь 3033,6 кв. м. Составные части и принадлежности: котельная, четыре пристройки
Гараж, инв. № 335/D-56898 (Муляровский с/с, 9/7-1). Нежилое, изолированное, на 1-м этаже здания гаража с инв. № 335/С-46939, год постройки 1997. Общая площадь 162,7 кв. м
Гараж, инв. № 335/D-56897 (Муляровский с/с, 9/7-2). Нежилое, изолированное, на 1-м этаже здания гаража с инв. № 335/С-46939, год постройки 1997. Общая площадь 82,2 кв. м
Здание обезжелезивания, инв. № 335/С-85357 (Муляровский с/с, 9/8). Одноэтажное кирпичное здание, год постройки 1978. Общая площадь 124,5 кв. м
Здание грузчиков, инв. № 335/С-85359 (Муляровский с/с, 9/9). Одноэтажное кирпичное здание, год постройки 1979. Общая площадь 64,5 кв. м
Здание проходной, инв. № 335/С-85356 (Муляровский с/с, 9/10). Одноэтажное кирпичное здание, год постройки 1979. Общая площадь 23,9 кв. м
Здание ГСМ, инв. № 335/С-85358 (Муляровский с/с, 9/11). Одноэтажное кирпичное здание, год постройки 1979. Общая площадь 34,7 кв. м
Площадка для стоянки машин, инв. № 335/С-81219 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Ввод в эксплуатацию 1978. Общая площадь 306,0 кв. м
Дорога ж/б между 2 и 3 печами, инв. № 335/С-81220 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Ввод в эксплуатацию 1990. Общая площадь 1479,0 кв. м
Пожарный резервуар, инв. № 57, инв. № 335/С-81221 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Ввод в эксплуатацию 1978. Объем 250,0 м куб.
Труба дымовая, инв. № 318, инв. № 335/С-81226 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Ввод в эксплуатацию 1978. Высота 60,0 м
Площадка для гаража, инв. № 335/С-81736 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Ввод в эксплуатацию 1978. Общая площадь 548,0 кв. м
Дымовая труба, инв. № 335/С-90676 (Муляровский с/с, дымовая труба на территории ОАО «Гомельский домостроительный комбинат»). Год постройки 2002. Общая площадь 1,0 кв. м. Высота 30,0 м
Реконструкция вращающихся печей обжига с переводом на природный газ, инв. № 335/С-90536 (Муляровский с/с, территория ОАО «Гомельский домостроительный комбинат»). Ввод в эксплуатацию 2009. Общая площадь 385,5 кв. м. Составные части и принадлежности: ГРП, газопровод наземный, трубопровод ст 219, трубопровод ст 159, трубопровод ст 89, трубопровод ст 100, газопровод подземный
Земельный участок для обслуживания объектов с инв. №№ 335/С-46956, -46937, -56898, -56897, -85357, -85359, -85356, -85358, -81217, -81218, -81219, -81220, -81221, -81226, -81736, -90676, -90536 **на праве постоянного пользования** площадью **5,0479 га** с кадастровым номером 324386400001000019. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,3444 га**
Земельные участки для обслуживания объекта с инв. № 335/С-90536 **на праве аренды сроком по 10.12.2107 г.** площадью **0,0056 га** с кадастровым номером 324300000001000765, площадью 0,0148 га с кадастровым номером 324300000001000766
Административный корпус, двухэтажный, кирпичный, инв. № 335/С-47056 (Муляровский с/с, 3). Двухэтажное кирпичное здание, год постройки 1978. Общая площадь 946,1 кв. м. Составные части и принадлежности: две пристройки, подвал
Земельный участок для обслуживания объекта с инв. № 335/С-47056 **на праве постоянного пользования** площадью **0,1787 га** с кадастровым номером 324386400001000021
Здание столовой, одноэтажное, кирпичное, инв. № 335/С-47096 (Муляровский с/с, 10). Одноэтажное кирпичное здание, год постройки 1980. Общая площадь 228,4 кв. м
Земельный участок для обслуживания объекта с инв. № 335/С-47096 **на праве аренды сроком по 05.04.2066 г.** площадью **0,1312 га** с кадастровым номером 324386400001000022. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0738 га**
Подъездная дорога к карьеру, инв. № 335/С-54740 (Гомельская обл., Петриковский р-н). Ввод в эксплуатацию – 1976. Протяженность 1060,5 м
Земельный участок для обслуживания объекта с инв. № 335/С-54740 **на праве аренды сроком по 05.04.2066 г.** площадью **4,6599 га** с кадастровым номером 324386400001000043. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, – 1,6151 га, в прибрежных полосах водных объектов – 0,1236 га**
Здание котельной, двухэтажное, панельное, инв. № 335/С-46940 (Муляровский с/с, 9/1). Двухэтажное панельное здание, год постройки 1978. Общая площадь 1127,5 кв. м. Составные части и принадлежности: две пристройки, труба
Сооружение склада готовой продукции, инв. № 335/С-47036 (Муляровский с/с, 9/2). Одноэтажное сооружение, год постройки 1978. Общая площадь застройки 545,0 кв. м
Материальный склад, одноэтажный, панельно-кирпичный, инв. № 335/С-46996 (Муляровский с/с, 9/3). Одноэтажное панельно-кирпичное здание, год постройки 1976. Общая площадь 1376,9 кв. м. Составные части и принадлежности: две рампы
Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, одноэтажное кирпично-панельное, инв. № 335/С-46976 (Муляровский с/с, 9/6). Одноэтажное кирпично-панельное здание, год постройки 1978. Общая площадь 1208,5 кв. м. Составные части и принадлежности: крыльцо
Сооружение железнодорожного пути, инв. № 335/С-47136 (Муляровский с/с, 9). Ввод в эксплуатацию 1978. Протяженность 2155 м. Составные части и принадлежности: верхнее строение пути, земляное полотно, искусственные сооружения, участок пути
Внутриплощадочные дороги и подъезды, инв. № 335/С-54738 (Муляровский с/с, 9). Ввод в эксплуатацию 1978. Площадь 5473,0 кв. м. Составные части и принадлежности: пешеходные дорожки
Маневровое устройство, инв. № 335/С-54741 (Муляровский с/с, 9). Ввод в эксплуатацию 1978. Площадь 3,0 кв. м
Пожарный резервуар, инв. № 5700, инв. № 335/С-81222 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Ввод в эксплуатацию 1978. Объем 250,0 м. куб.
Труба дымовая, инв. № 319, инв. № 335/С-81223 (Муляровский с/с, терр. Петриковского керамзитового завода). Ввод в эксплуатацию 1978. Высота 28,0 м
Труба дымовая, инв. № 18, инв. № 335/С-81224 (Муляровский с/с, терр. Петриковского керамзитового завода). Ввод в эксплуатацию 1978. Высота 38,0 м
Склад глины, инв. № 335/С-81225 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Железобетонное, год постройки 1991. Общая площадь 1345 кв. м
Резервуар повторного использования воды, инв. № 335/С-81228 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Ввод в эксплуатацию 1978. Общая площадь 97,9 кв. м
Мазутное хозяйство, инв. № 335/С-81227 (Муляровский с/с, 29/1). Год постройки 1978. Составные элементы сооружения: резервуары, нулевая емкость, эстакада, мазутопроводы, мазутонасосная станция, пристройки
Земельный участок для обслуживания объектов с инв. №№ 335/С-46940, -47036, -46996, -46976, -47136, -54738, -54741, -81217, -81218, -81222, -81223, -81224, -81225, -81228, -81227, -90536 **на праве аренды сроком по 05.04.2066 г.** площадью **8,1601 га** с кадастровым номером 324386400001000081
Внутриплощадочные кабеля № 68, инв. № 335/С-81217 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Сеть электроснабжения, год постройки 1978. Протяженность 103,6 м. Составные части и принадлежности: эстакада, опора, фундамент, кабель
Сети водопроводные № 64, инв. № 335/С-81218 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Участок водопроводной сети с 18-ю колодцами, водонапорная башня, два ограждения, дорожка, две артскважины. Год постройки 1978. Протяженность 1389,9 м
Земельные участки для обслуживания объектов с инв. №№ 335/С-81217, -81218: **на праве аренды сроком по 05.04.2066 г.** площадью **8,1601 га** с кадастровым номером 324386400001000081; **на праве постоянного пользования** площадью **5,0479 га** с кадастровым номером 324386400001000019 **(имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,3444 га)**
Участок канализационной сети, двенадцать трубопроводов, инв. № 335/С-81738 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Участок канализационной сети с канализационной станцией перекачки (инв. № 49). Год постройки 1978, 1991. Длина трубопровода 1620,5 м. Составные части и принадлежности: девять колодцев, две арматуры
Земельный участок для обслуживания объекта с инв. № 335/С-81738 **на праве аренды сроком по 20.11.2067 г.** площадью **0,0065 га** с кадастровым номером 324386400001000114. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, площадь 0,0065 га**
Поля фильтрации инв. № 48, инв. № 335/С-81737 (Муляровский с/с, территория Петриковского керамзитового завода). Ввод в эксплуатацию – 1978. Общая площадь 19234,0 кв. м. Составные части и принадлежности: две карты полей фильтрации, сеть распределительного трубопровода, два распределительных лотка, резервуары, два резервуара (отстойника)
Земельный участок для обслуживания объекта с инв. № 335/С-81737 **на праве аренды сроком по 20.11.2067 г.** площадью **2,2988 га** с кадастровым номером 324386400001000115. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемом, – 1,5484 га, в охранных зонах электрических сетей – 0,8819 га**
ЛЭП 10 кВт завод-карьер (инв. № 38), инв. № 335/С-81957 (Гомельская обл., Петриковский р-н, ЛЭП 10 кВт завод-карьер «Кустиха»). Год постройки 1977. Протяженность 6771,5 м. Составные части и принадлежности: три участка линии электропередачи, 70 опор линии электропередачи, провода, ограждение, калитка
Земельные участки, на которых расположено сооружение с инв. № 335/С-81957, **на праве постоянного пользования** с кадастровыми номерами 324300000001000715 – 324300000001000727, 324300000001000738 – 324300000001000763, 324300000001000768, 324300000001002289 общей площадью **3,0345 га; на праве аренды** с кадастровыми номерами 324300000001001671 – 324300000001001674 общей **площадью 0,0763 га**
Автотранспортные средства:
Автобус ПАЗ-4234 ПКЗ, гос. № АВ 7454-3 (инв. № 31); автомобиль ГАЗ 31105, гос. № 25-45 ПКЗ (инв. № 3); автомобиль ГАЗ 32213-415 ПКЗ, гос. № АВ 2356-3 (инв. № 1); автомобиль ГАЗ-3110 ПКЗ, гос. № ВВ 1585-3 (инв. № 16); автомобиль МАЗ-5516А5 ПКЗ, гос. № АВ 7465-3 (инв. № 32); автомобиль МАЗ-5516А5 ПКЗ, гос. № АВ 7467-3 (инв. № 34); автомобиль МАЗ-5516А5 ПКЗ, гос. № АЕ 0891-3 (инв. № 41)
Прочее имущество (машины, оборудование, инвентарь и др.) в количестве 120 наименований согласно перечню имущества по состоянию на 30.10.2019 г. (С указанным перечнем имущества можно ознакомиться у организатора торгов на сайте **gino.by** и по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 2.6 или у собственника имущества по адресу: г. Гомель, ул. Лазурная, 17, каб. 108)
Часть имущества сдана в аренду сроком по 07.05.2023 г. по договору № 5350/18 от 17.12.2018 г. (С перечнем сданного в аренду имущества можно ознакомиться у организатора торгов по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 2.6 или у собственника имущества по адресу: г. Гомель, ул. Лазурная, 17, каб. 108)
Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь
Начальная цена лота № 1 – 6 214 868,24 рубля (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток по лоту № 1 – 31 074,34 рубля** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)
Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 9 декабря 2019 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются. В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **10 декабря 2019 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников. Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %. **При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно представляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть. Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №1** согласно извещению в газете «Звязда» от 6 ноября 2019 г. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 0,5 % от окончательной цены продажи Объектов; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объектов, такая оплата должна быть произведена в течение 60 календарных дней после проведения аукциона
Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ +375 (232) 32-46-47; 32-18-95, +375 (29) 170-46-47 • сайт: gino.by • e-mail: **auction-gino@gino.by** **Продавец:** ОАО «Гомельский ДСК», г. Гомель, ул. Лазурная, 17. ☎ +375 (29) 181-48-33, +375 (232) 50-22-73.

Унитарное предприятие «Молодечненский пищевой комбинат» объявляет аукцион

Организатор торгов: антикризисный управляющий ООО «Бизнесарсенал» Волынец Антон Игоревич, тел. 8 029-6213137

Продавец: унитарное предприятие «Молодечненский пищевой комбинат» (УНП 600078150), ул. Л. Роменская, 62, 222310, г. Молодечно. Тел. 0176-777617; факс 0176-770484, e-mail: **molodechnopk@mail.ru**

Торги будут проведены в форме открытого аукциона в электронной форме на электронной торговой площадке **https://torgi.gov.by: 11 декабря 2019 г. 8.00.**

Предмет торгов представляет собой недвижимое и движимое имущество должника (производственные здания и сооружения, промышленное оборудование и др.) и состоит из 5 лотов, перечень лотов находятся на сайте **https://torgi.gov.by.**

Прием заявок: с 6 ноября 2019 г. 9.00 по 10 декабря 2019 г. 16.00

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена продажи имущества с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Лот № 1	Автомат POLPAK D1000 для фасовки и упаковки вязких жидкостей в пакеты типа «doy-pack», 2008 г. в., зав. № 0961	66 636,00
Лот № 2	Емкость вертикальная пластиковая объемом V = 10 куб. м	1 220,40
Лот № 3	Павильон для хранения стеклобанки, инв. № 630/С-4738	157 680,00
Лот № 4	Здание квасильно-засолочного пункта, инв. № 630/С-16625	41 040,00
Местонахождение предметов торгов: Минская область, г. Молодечно, ул. Либаво-Роминская, 62		
Лот № 5 одним лотом	Комплекса зданий и сооружений детского оздоровительного лагеря «Дружный», расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000434, площадью 6,0093 га	1 459 477,44
Местонахождение – Минская область, Минский район, Колодищанский с/с, район п. Городище		

Контактный телефон для ознакомления и осмотра в рабочие дни по предварительному согласованию по тел. + 375 29 356 81-04, Виталий Николаевич.

Для участия в торгах необходимо в срок по 14 октября 2019 г.: 1) зарегистрироваться на торговой площадке, подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **https://torgi.gov.by**; 2) направить организатору торгов в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы на e-mail **molodechnopk@mail.ru;** 3) осуществить перечисление задатка на счет торговой площадки: РУП «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь». Адрес: г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513, УНП: 190318109, р/с: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000, ОАО «Банк БелВЭБ», БИК: BELBBY2X (подробнее в информации лота на сайте https://torgi.gov.by).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем электронных торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи предмета торгов и в течение 30 дней производится оплата.

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б		
Продавец	ООО «Триумфстрой», г. Минск, ул. Л. Украинки, 16, каб. 6		
Предмет аукциона Месторасположение **– г. Минск, ул. Евфросиньи Полоцкой, 5**			
Наименование	Общая площадь	Инв. номер	Адрес (№ квартиры)
Лот № 1			
Квартира	55,6 кв. м	500/D-708179540	81
Начальная цена лота № 1 без НДС – 219 405,00 бел. руб. **Шаг аукциона – 10 970,25** бел. руб.			
Лот № 2			
Квартира	55,2 кв. м	500/D-708179543	84
Начальная цена лота № 2 без НДС – 217 400,00 бел. руб. **Шаг аукциона – 10 870,00** бел. руб.			

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Климашин А. Г., тел. 8029-392-50-44

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: в день подписания договора купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

Возмещение затрат и оплата вознаграждения за организацию аукциона возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата, место и время проведения аукциона	**10.12.2019** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата, место и время окончания приема документов	**09.12.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контактные телефоны	+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Ва ўсе вочы!

ПРА ЗРОК — З ГУМАРАМ

Як захаваць здароўе вачэй, школьнікам нагадае комікс

У Беларусі выпусцілі прыгодніцкі комікс «Погляд у мінулае» ў падтрымку дабрачыннага сацыяльнага праекта «Я бачу!». Яго героі расказваюць чытачам пра тое, як важна захаваць здаровы зрок і своечасова адрэагаваць на змены ў яго стане.

Гэта прыгодніцкая і крыху дэтэктыўная гісторыя пра школьніцу Алесю і яе сяброў, якія знаходзяць выйсце з любой няпростай сітуацыі з дапамогай акуляраў.

— Комікс выйшаў на беларускай мове. Такім чынам мы вырашылі далучыць яшчэ больш школьнікаў да роднай мовы і культуры, — расказвае **спецыяліст групы па карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці кампаніі А1 Кацярына СЕВАСЦЬЯНЧУК.**

— Мы папулярызуем дзве мовы. Першая з іх — беларуская, другая — мова комікса, якую таксама трэба разумець. Гэта гісторыя пра жыццё дзяцей, якія сутыкаюцца з нашэннем акуляраў. Пры падрыхтоўцы комікса мы імкнуліся стварыць прыгодніцкую і міфічную атмасферу, уласцівую творам знакамітага беларускага пісьменніка Янкі Маўра, — дадае **заснавальнік творчага аб'яднання «Сучасны комікс» Мікіта СЕННІКАЎ.**

Гісторыя атрымае працяг — комікс будзе складацца з трох частак. Другая з іх пад назвай «Не для чужых вачэй» з'явіцца ўжо ў снежні. Распаўсюджвацца прыгодніцкія гісторыі будуць у крамах OZ бясплатна.

— Кожнае дзіця, старэйшае за 10 гадоў, якое разам з бацькамі ці без іх зробіць пакупку ў нашым магазіне ў Мінску на праспекце Пераможцаў, 3 ці ў Віцебску на вуліцы Леніна, 65, атрымае комікс у падарунак, — кажа **PR-спецыяліст кампаніі OZ Настасся ЗОТАВА.**

«Я бачу!» — маштабны дабрачынны праект па дыягностыцы і раннім выяўленні захворванняў зроку ў дзяцей з сельскай мясцовасці Беларусі. Ён рэалізуецца беларускім дзіцячым фондам і кампаніяй А1 пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя. Мабільныя брыгады афтальмолагаў наведваюць вясковыя школы, дзе праводзяць агляд дзяцей. Той, хто мае праблемы, атрымлівае рэцэпт на акуляры або накіраванне на далейшую паглыбленую дыягностыку. З 2016 да 2018 года ў межах праекта ўрачы агледзелі амаль 37 тысяч сельскіх школьнікаў у Магілёўскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцях. Сёлета афтальмолагі працуюць на Віцебшчыне, дзе да канца года плануюць абследаваць дзяцей ва ўсіх раёнах рэгіёна. Агульная колькасць абследаваных падчас праекта школьнікаў перавысіць 50 тысяч.

Скажыце, доктар...

ВОСЕНЬ БЕЗ ПРАСТУД

Як правільна абараняць дзіця ад рэспіраторных інфекцый

Сезон рэспіраторных інфекцый адкрыты. І калі абараніцца ад грыпу можна з дапамогай прышчэпкі, то як супрацьстаяць астатнім сезонным захворванням, не зразумела. Згодна з даследаваннямі, гарадское дзіця за 13 гадоў жыцця хварэе ў сярэднім 36 разоў, а гэта прыкладна тры прастуды на год, прычым у асноўным восенню і зімой, радзей — вясной. Чаму і чым хварэюць дзеці ўвосень і якіх хвароб больш за ўсё апасаюцца педыятры, а таксама як паўнацэнны рацыён абараняе нас ад інфекцый і чаму дзецям катэгарычна забаронена «прывіваць» вегетарыянства і веганства, расказала намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Вера ПАЯРКОВА.

— Вера Мяфодзьеўна, чаму восенню дзеці часцей хварэюць?

— Наведваць установы адукацыі яны пачынаюць пераважна з верасня. І ў гэты час калектывы, у прыватнасці, у дзіцячых садках напаўняюцца новымі дзецьмі. І кожны з іх нясе свой набор вірусаў і мікраарганізмаў. У дзіцячых калектывах адбываецца абмен мікрафлорай. Натуральна, кожны арганізм, сутыкнуўшыся з новымі вірусамі і мікробамі, рэагуе. Пачынае нязначна пакутаваць імунная сістэма дзіцяці, прычым у кожнага свой імунны адказ на ўкараненне новых мікраарганізмаў. Таму павялічваецца частата вострых вірусных захворванняў, рэспіраторных захворванняў, якія перадаюцца паветрана-кропельным шляхам праз верхнія дыхальныя шляхі. Што датычыцца дзяцей школьнага ўзросту, то ўсё лета іх арганізм быў вольны ад чужых вірусаў і мікраарганізмаў, а ў класным калектыве гэтак жа адбываецца абмен мікрафлорай, і мы атрымліваем нязначнае павелічэнне захваральнасці.

«Катэгарычна нельга прывіваць дзецям веганства ці вегетарыянства — гэта стварае дэфіцыт бялку пры фарміраванні гарманальнага статусу дзіцяці. І адпаведна ад нястачы гармонаў будуць пакутаваць усе сістэмы арганізма».

Да таго ж лета і патачак восені — гэта час, багаты на фрукты і агародніну. Калі бацькі забываюць памыць скурку кавуна, дыні ці іншых фруктаў, паверхні якіх населены мікраарганізмамі, гэта, як і нямытыя рукі, прыводзіць да павышанай колькасці энтэравірусных інфекцый. Таму летам і ў пачатку восені маюць месца як рэспіраторныя, так і энтэравірусныя інфекцыі. Гэтым тлумачыцца павышаная захваральнасць.

— Якія хваробы часцей за ўсё сустракаюцца ў гэту пару?

— Захворванні верхніх дыхальных шляхоў — **адэнаідыты** (запаленне адэноідаў, якое ўскладняе насавое дыханне), **сінусіты, атыты, фарынгіты, бранхіты.** Пнеўманія ў гэтым сезоне бывае вельмі рэдка. Бо яна — следства частых бранхітаў, і назіраецца звычайна глыбокай восенню і зімой, калі вядучую ролю адыгрывае пераахаладжэнне. Хоць трэба заўважыць, што пнеўманіі здараюцца і летам, калі падчас высокіх тэмператур прадзімае на скразняку. Таксама выклікаць хваробу могуць і кандыцыянеры ў аўтамабілях і памяшканнях, калі фільтры доўгі час не абслугоўваюцца належным чынам, вірусы назапашваюцца ў фільтровачных аўтаматах, і мы дыхаем пнеўмакокамі, якія распаўсюджваюцца аэразольным шляхам.

— Якога захворвання больш за ўсё апасаюцца педыятры?

— Самае грознае захворванне, канешне, пнеўманія. Таксама ў маленькіх дзяцей небяспечныя адэнаідыты, якія з-за няправільнага падыходу да лячэння насаглоткі перарастаюць у атыты. Бацькі актыўна карыстаюцца ўсемагчымымі спрэямі, фізіялагічнымі растворамі, якія пад ціскам упырскваюць у насавыя хады для прачысткі слізі ў насавых ракавінах. Няправільнае прымяненне такіх сродкаў пад высокім ціскам вядзе да таго, што слізь прасоўваецца глыбей і трапляе ў слыхавую трубу. Гэта выклікае атыты, якія цяжка лечацца.

Мы насцярожаны і ў адносінах менінгакокавай інфекцыі. Гэтым летам мы, напрыклад, апасаліся адру ў дзяцей. Але гэта вакцынакіруемая інфекцыя. І калі бацькі правільна адносяцца да вакцынацыі дзяцей, згодна з нацыянальным календаром робяць прышчэпкі, то дзеці абаронены ад многіх хвароб, у прыватнасці, ад адру, пнеўманіі, гемафільнай інфекцыі. Прышчэпка ад той жа гемафільнай інфекцыі аблягчае цячэнне ці ўвогуле пазбаўляе ад частых хвароб дыхальных шляхоў: рынітаў, адэнаідытаў, атытаў, бранхітаў. Правільная вакцынацыя стымулюе работу імуннай сістэмы, павышае ахоўныя сілы арганізма, выпрацоўвае ахоўныя імунаглабуліны класа А. Дзіця не так часта і не так цяжка хварэе.

— Што яшчэ, акрамя вакцынацыі, могуць зрабіць бацькі, каб абараніць дзіця ад захворвання?

— Важна весці здаровы лад жыцця, прытрымлівацца гігіенічных мерапрыемстваў. Тое ж мыццё рук і фруктаў абмяжоўвае паступленне як рэспіраторных, так і энтэравірусаў у арганізм. Пасля наведвання шматлюдных месцаў памыць рукі і прасаніраваць нос — гэта азбука гігіены. Варта знаходзіць час для прагулак на свежым паветры — для дзяцей гэта каля чатырох гадзін штодзень, таксама мець паўнацэнны сон і адпачынак, пазбавіць дзіця ад тытунёвага дыму, калі бацькі курыць, і забяспечыць паўнацэннае харчаванне. Калі ў дзіцяці збалансаваны рацыён, імунадэфіцыт яму не пагражае. Пры ўжыванні 100—200 грамаў натуральнага, а не паўфабрыкатнага мяса ў арганізме фарміруюцца правільныя бялкі, якія выпрацоўваюць імунаглабуліны. Яны садзейнічаюць стварэнню супрацьвіруснага імунітэту і гарманальнай сістэмы. Усе гармоны «падвязаны» на бялкі. Калі мы не будзем есці мяса, не будуць выпрацоўвацца бялкі, адпаведна, гармоны. Гармоны шчытападобнай залозы і надныračнікаў таксама ўплываюць на імунную сістэму. Таму збалансаванае харчаванне садзейнічае мінімальнай рызыцы заражэння рэспіраторнымі інфекцыямі. Абавязкова трэба памятаць, асабліва тым, хто жыве ў мегаполісе, што важна ўжываць вітамін D3, ён уплывае на фарміраванне коснага шкілета ў маленькіх дзяцей і імуннай сістэмы, у прыватнасці.

«Пасля наведвання шматлюдных месцаў памыць рукі і прасаніраваць нос — гэта азбука гігіены».

— Ці варта дадаваць вітамінныя комплексы, імунамадулятары?

— Вітаміны летам і ўвосень мы атрымліваем з прадуктамі харчавання. А вось морапрадуктаў у нас не так шмат. Калі бацькі будуць дадаваць у рацыён морапрадукты, то на нейкі час мы можам адмовіцца ад вітамінных комплексаў. Калі морапрадуктаў у рацыёне мала, то альтэрнатыва — вітамін D3. Даказальнай базы карысці ад прыёму імунамадулятараў няма, таму калі ўрач-педыятар іх не прызначыў, у імунную сістэму лепш не ўмешвацца, а правільна арганізаваць рацыён. Катэгарычна нельга прывіваць дзецям веганства ці вегетарыянства — гэта стварае дэфіцыт бялку пры фарміраванні гарманальнага статусу дзіцяці. І адпаведна ад нястачы гармонаў будуць пакутаваць усе сістэмы арганізма. Дзіця будзе адставаць ад равеснікаў як у разумовым, так і ў фізіялагічным развіцці.

— Які сродак у абароне ад інфекцый найлепшы?

— Ад інфекцый, якія перадаюцца паветрана-кропельным шляхам, а таксама энтэравірусных — вакцынацыя. Супрацьпаказанняў для правядзення прафілактычных прышчэпак амаль няма. Іх нельга рабіць пры высокай тэмпературы і пры вельмі цяжкіх хваробах. Калі дзіця ў стане рэмісіі, яму можна і трэба рабіць прышчэпкі. Так ствараецца дастатковая імунная праслойка папуляцыі, тым самым мы папярэджваем частыя інфекцыі.

ПРАВЯРАЦЬ ЦІ ЗААХВОЧВАЦЬ?

Як працуюць на якасць адукацыі адзнакі, канкурэнцыя і рэйтынгі...

Уінстан Чэрчыль калісьці сказаў, што настаўнікі валодаюць уладай, пра якую прэм'ер-міністры могуць толькі марыць. Але сітуацыя карэнным чынам змянілася, прычым не толькі ў нашай краіне... Пра гэта казалі і замежныя педагогі — удзельнікі EdCamp Belarus—2019. Гасцямі трэцяй педагагічнай (не)канферэнцыі сталі Данута СТЭРНА, эксперт Цэнтра грамадзянскай адукацыі з Варшавы, дзякуючы якой дзесяць гадоў таму ў Беларусь прыйшла актыўная ацэнка, і Рос Морысан МАКГІЛ — вядомы настаўнік, пісьменнік, блогер і стваральнік сайта teachertoolkit.co.uk (інструменты для настаўніка), у якога цяпер больш за 10 мільёнаў чытачоў. Рос намінаваўся газетай The Sunday Times у лік 500 самых уплывовых людзей у Вялікабрытаніі. Мы скарысталіся выпадкам, каб задаць аўтарытэтным педагогам пытанні, якія хвалююць іх беларускіх калег.

— Якасць адукацыі і імідж настаўніка ў грамадстве. Ці ўзаемазвязаныя гэтыя паняцці? Ад каго настаўнік не абаронены ў большай ступені: ад вучняў, іх бацькоў, адміністрацыі ці кантрольных органаў?

Рос МАКГІЛ: — Урад сёння не фінансуе школы на дастатковым узроўні. І ўтрымліваць шмат педагогаў-прафесіяналаў становіцца для ўстаноў адукацыі занадта дорага. Але кожнай школе патрэбныя дасведчаныя настаўнікі, якія будуць дзяліцца з маладымі сваім прафесійным вопытам. За апошнія гады я апытаў прыблізна 20 тысяч настаўнікаў, з іх толькі каля 100 чалавек сказалі, што прысвяцілі педагогіцы дваццаць і больш гадоў. Статыстыка сведчыць, што ў сярэднім настаўнік працуе ў школе 13 гадоў. Педагагічная праца становіцца ўсё больш складанай і псіхалагічна напружанай, ускладняюцца праграмы, экзамены, настаўнікаў у школах застаецца ўсё менш, а нагрузка на іх расце.

Палітыкі мяркуюць, што могуць і далей выдаткоўваць менш сродкаў на школы і губляць педагогаў. Апошнія ўсё часцей вырашаюць змяніць сферу сваёй дзейнасці і зарабляць грошы ў іншым месцы. У іх ёсць сем'і, дзеці, пэўныя патрэбы, якія трэба задавальняць. Да таго ж для нас надзвычай актуальная праблема прафесійнага выгарання. Бацькі вучняў могуць паскардзіцца на настаўніка з любой нагоды: ад нейкай дробязі, кшталту «дзіця згубіла пенал», да больш сур'ёзных. А калі яны паведамляюць, што іх сын ці дачка адчуваюць сябе ў школе неабароненымі, туды накіроўваецца праверка. Настаўніка могуць пакараць, напрыклад, аб'явіць вымову. Калі адбылося штосьці насамрэч сур'ёзнае, ён можа страціць работу, а калі ўвогуле надзвычайнае — яму могуць забараніць выкладанне на ўсё далейшае жыццё.

Мы арганізуем у школах саветы настаўнікаў, каб пазбегнуць залішняга ціску з боку кантрольных органаў. Лепш калегі растлумачаць, чаму настаўнік не меў рацыі, чым вышэйстаячы орган будзе выносіць гэтыя пытанні на ўсеагульнае абмеркаванне за сцены школы. Такія моманты дрэнна ўплываюць на імідж педагога ў грамадстве, тым больш што і бацькі, і палітыкі сёння не вельмі давяраюць настаўнікам. Я лічу, што мы самі павінны больш падтрымліваць адзін аднаго і

Данута СТЭРНА: «Навучанне не будзе эфектыўным, калі пазбавіць дзіця шанцу на поспех».

надаваць адзін аднаму ўпэўненасці. А нас матывуюць спаборнічаць, а не дзяліцца ідэямі. Усе школы імкнуцца аказацца ўверсе шматлікіх рэйтынгаў.

Я даследаваў праблемы, з якімі сутыкаюцца настаўнікі. Чаму яны сыходзяць са школ? Дык вось, на першым месцы ў брытанскіх педагогаў стаіць вялікая працоўная нагрузка (у тым ліку бюракратыя, неабходнасць маніторыць, перадаваць розныя звесткі, запаўняць журналы, клапаціцца пра выстаўленне вялікай колькасці ацэнак і г. д). На другім — ініцыятывы, спушчаныя «зверху», і на трэцім — ціск і кантроль з боку кіраўніцтва школ. Не праводзілася ніякіх даследаванняў і, адпаведна, няма ніякіх доказаў, што напісанне дэталёвага плана ўрока неяк уплывае на яго якасць. Затое для кіраўніцтва школ наяўнасць ці адсутнасць плана — інструмент для ціску. Ты дваццаць гадоў выкладаеш у школе, а да цябе на ўрок прыходзіць інспектар, які за 20—30 хвілін знаходжання ў класе выносіць табе прысуд — выстаўляе ў сваіх паперах крыжыкі ці балы. Я лічу, што ў нас цяпер створана мадэль, якая выпіхвае настаўнікаў са школы.

Данута СТЭРНА: — Я ўпэўнена, што ад якасці адукацыі залежыць будучыня любой краіны. Мая дзейнасць у Цэнтры грамадзянскай адукацыі нацэлена менавіта на пошук спосабаў, як змяніць сістэму адукацыі ў лепшы бок, знайсці для гэтага эфектыўныя рычагі. І, шчыра кажучы, я не веру ў тое, што рэформы, спушчаныя зверху, могуць паўплываць на рэальную сітуацыю ў нашых школах, нават калі б яны былі прадуманыя і мудрыя. Дырэктывы, што нараджаюцца наверсе, не працуюць, калі дасягаюць практычнага ўзроўню. Яны ператвараюцца ў прафанацыю, усё робіцца толькі для птушачкі. А вось калі неабходнасць перамен будзе прынятая душой і сэрцам настаўніка, мы зможам атрымаць чаканы эфект. Любыя новаўвядзенні ўпіраюцца ў канкрэтных людзей, якія будуць іх укараняць. Новая школа патрабуе новага настаўніка, які стане рухавіком перамен. З іншага боку, я разумею, што цяжка патрабаваць ад педагога быць наватарам, калі яго загружаюць рознымі абавязкамі звыш меры.

— Людзі не заўсёды разумеюць, што ім прапануюць і навошта трэба штосьці змяняць. Але міністр аховы здароўя не абавязаны тлумачыць публіцы, чаму змяняецца, напрыклад, метад выдалення апендыцыту. А педагогі вымушаны наладжваць камунікацыі з грамадствам, нават калі змяняецца змест падручнікаў для пачатковых класаў. Таму што любыя змены цягнуць грамадскі рэзананс... Як давесці да бацькоў, што школа ў XXI стагоддзі не можа жыць па законах мінулага стагоддзя?

Рос МАКГІЛ: — Шчыра кажучы, адказу на гэта пытанне ў мяне няма. Урачам ніхто з пацыентаў не ўказвае, як лячыць. Затое ўсе ахвотна лезуць са сваімі парадамі да настаўнікаў. У педагогіцы — усе лічаць сябе спецыялістамі. Тады ў мяне да вас сустрэчнае пытанне — а ці ведаеце вы, як працуе дзіцячая памяць? Вам вядомыя асаблівасці невербальнай камунікацыі? Мова цела? Псіхалагічныя нюансы? Вы ведаеце, як можна матываваць дзіця, стварыць яму сітуацыю поспеху? А як зрабіць так, каб вучню стала сорамна за свае паводзіны ці свой учынак? Як паставіць на месца падлетка, які са скуры вылузваецца? Калі ў цябе на ўроку 30 чалавек, гэтым класам трэба ўмець кіраваць. Ты павінен казаць толькі па сутнасці пытання, бо ў цябе мала часу, а вось задач і спраў насамрэч шмат. Трэба ад усіх 30 выхаванцаў атрымаць на ўроку зваротную сувязь, забяспечыць умовы, каб усім было камфортна працаваць. Але калі я рыхтую вучняў да экзамену, то наадварот стараю для іх стрэсавую сітуацыю. Калі ў 35 гадоў я застаўся без работы і мне сказалі, што мяне не жадаюць бачыць у школе, я вырашыў, што я труп, у мяне было вельмі шмат праблем са здароўем. Уменне дзейнічаць у стрэсавай сітуацыі, ва ўмовах нявызначанасці, непрадказальнасці, супраціўляцца знешнім фактарам — таксама вельмі важны жыццёвы навык.

Сёння вельмі важна фарміраваць так званыя скразныя кампетэнцыі (яны ўключаюць і асобасныя (напрыклад, лідарства), і міжасобасныя, і медыяінфармацыйныя. — **Аўт.**), развіваць крытычнае мысленне, уменне працаваць з інфармацыяй, адрозніваць праўду ад хлусні, бачыць рэкламныя маніпуляцыі. Мабільнасць, гнуткасць у розных сітуацыях, уменне вучыцца ўсё жыццё — больш важныя, чым проста веданне матэматыкі.

— Ці могуць дзеці вучыцца для задавальнення, а не для атрымання адзнакі? Вы можаце ўявіць сабе школу ўвогуле без адзнак?

Данута СТЭРНА: — Мы разам з калегамі з Цэнтра грамадзянскай адукацыі нават заснавалі групу пад назвай Dziecko bez stopni — «Дзіця без адзнакі», у якой больш за тысячу настаўнікаў. Мы шмат працуем у гэтым кірунку, асабліва ў малодшых класах, бо страх перад дрэннымі адзнакамі і пакланенне добрым фарміруюцца літаральна з першых гадоў навучання. І чым пазней у школу прыйдуць адзнакі ў балах, тым будзе лепш для дзяцей. Аднак укараняць нашу філасофію вельмі складана, бо ўвесь свет літаральна «захварэў» на экзамены і рэйтынгі. Мы ніяк не хочам зразумець, што ацэнкі служаць толькі канкурэнцыі за кошт нейкіх лічбаў. Усе вымушаны даказваць, што твая школа лепшая за суседнюю. Паверце, што і без адзнак у балах навучанне і рух наперад магчымыя, проста трэба замяніць ацэнкі зваротнай сувяззю, вусным каментарыем. Для педагогаў гэта магчымасць вярнуць у адукацыйны працэс найбольш слабых вучняў, каб яны атрымалі лепшыя вынікі і былі больш паспяховымі грамадзянамі. Школьніка трэба параўноўваць не з іншымі дзецьмі ў класе, а з самім сабой. Кожны хоча чуць найперш пра сябе — пра свае поспехі і няўдачы. Навучэнцы не любяць, калі іх ігнаруюць, а пахвала, калі ёсць рух наперад, і падказкі, як палепшыць свае вынікі, — замест адзнакі ў балах — іх стымулююць... Навучанне не будзе эфектыўным, калі пазбавіць дзіця шанцу на поспех. І зусім іншая справа, калі поспехі прызнаюцца і ацэньваюцца: у гэтым выпадку і да абгрунтаванай і канструктыўнай крытыкі навучэнцы паставяцца хутчэй як да карыснай...

— У вашай краіне школьнікі таксама скардзяцца на вялікі аб'ём дамашніх заданняў?

Данута СТЭРНА: — Гэта тэма часта ўзнікае ў Польшчы. На маю думку, дамашняе заданне трэба задаваць толькі тады, калі гэта насамрэч неабходна. Я ведаю з даследаванняў вядомага аўстралійскага прафесара Джона Хэці, што карысць ад выканання такіх заданняў павялічваецца з узростам. У прафесійнай літаратуры гаворыцца, што час на дамашняе заданне вылічваецца па наступнай форме: 10 хвілін трэба памножыць на клас, у якім вучыцца дзіця. Напрыклад, у першым класе — гэта 10 хвілін у дзень, у другім — 20, у пятым — 50 хвілін. 11 клас — 110 хвілін (гэта каля дзвюх гадзін у дзень на ўсе прадметы)

Асабіста я як настаўнік (Данута выкладае матэматыку. — **Аўт.**) пачала прапаноўваць дамашняе заданне на выбар, што значна палепшыла якасць яго выканання вучнямі. Ніколі не выстаўляю адзнакі за дамашняе заданне, якое задаю: імкнуся, каб навучэнцы ўсвядомілі, што гэта заданне — патрэба, а не абавязак.

Рос МАКГІЛ: «Нас матывуюць спаборнічаць, а не дзяліцца ідэямі. Усе школы імкнуцца аказацца ўверсе шматлікіх рэйтынгаў».

Няма ніякіх доказаў, што напісанне дэталёвага плана ўрока неяк уплывае на яго якасць.

Матывацыя мала сябруе з пачуццём абавязку. Вучань павінен мець унутраную матывацыю да навучання, і на гэта настаўнік можа паўплываць праз цікавыя ўрокі, складзеныя з улікам інтарэсаў розных вучняў у класе, карэляцыю праграмы з рэальным жыццём. Усвядомленае навучанне — гэта калі навучэнец ведае, навошта і чаму ён вучыцца. Я асабіста раблю стаўку на фарміруючае ацэньванне (у Беларусі — актыўная ацэнка). У маім блогу, https://osswiata.pl/sterna/, можна знайсці шмат практычных артыкулаў пра ўплыў настаўніка на матывацыю вучняў.

Што датычыцца таго, каб вучням давалася поўная самастойнасць, я лічу, што гэта небяспечна. У Польшчы былі створаны так званыя дэмакратычныя школы. Некаторыя з іх маюць выдатных педагогаў, запаленых, натхнёных ідэяй, і там усё добра. Але мы не можам разлічваць, што ў кожнай школе настаўнікі здольныя навучыць сваіх выхаванцаў адказна карыстацца поўнай свабодай. Таму, на маю думку, лепш стварыць сітуацыю, каб вучань мог выбіраць, але з пэўнага кола прапаноў, а не паміж вучобай і тым, каб увогуле нічога не рабіць і не вучыцца.

— А вы асабіста ці сталі б забараняць мабільныя тэлефоны ў школе?

Рос МАКГІЛ: — Так! Хто ведае, якія карыстальніцкія ўмовы ўстаноўлены для асобных мабільных праграм у тэлефонах? Важна, каб школы кантралявалі гэтыя пытанні для абароны дзяцей і іх псіхічнага здароўя.

Данута СТЭРНА: — Я не бачу ў гэтым праблем. Мяркую, што яны могуць быць карысныя пры навучанні, напрыклад, для пошуку хуткай інфармацыі на ўроку. Дзелавая атмасфера ў класе вельмі залежыць ад стасункаў, што складваюцца паміж настаўнікам і вучнямі, а ўрокі можна праводзіць так, каб тэлефоны не перашкаджалі, а дапамагалі.

— Вы знаёмыя з сістэмамі адукацыі розных краін. Скажыце, якая з іх вам найбольш імпануе? Можа быць, варта ўзяць нешта ў фінаў, кітайцаў, сінгапурцаў, спалучыць іх найбольш моцныя бакі, і тады мы атрымаем школу, якая ўсіх задаволіць: і грамадства, і вучняў з бацькамі, і педагогаў?

Данута СТЭРНА: — Мне найбольш блізкая фінская сістэма. Але я думаю, што яе нельга аўтаматычна трансляваць іншым краінам. Фіны працавалі над ёй шмат гадоў. Я аднойчы спытала ў фінскага чыноўніка, як у іх правяраецца якасць працы настаўнікаў, і ён мне адказаў, што яны вельмі даўно адмовіліся ад кантролю! Давайце і мы перастанем правяраць і ацэньваць, а лепш будзем ЗААХВОЧВАЦЬ. Сістэмы, арыентаваныя толькі на атрыманне ведаў і стымуляванне канкурэнцыі, я проста не выношу.

Рос МАКГІЛ: — Складана і бессэнсоўна параўноўваць сістэмы адукацыі ў розных краінах. Нельга проста ўзяць і скапіраваць чужую школу. Трэба глядзець, што падыходзіць менавіта вам. Мая парада: вазьміце тое, чаму можна павучыцца, і прапусціце праз свой нацыянальны кантэкст.

Усё пачынаецца з сумленных, складаных і празрыстых дыскусій на ўсіх узроўнях. Я веру, што любы настаўнік можа фарміраваць палітыку ў галіне адукацыі. Важна, каб грамадства, нарэшце, нас пачула. Супрацоўніцтва і дыялог з педагогамі — вельмі важны момант для будучыні школы.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота прадстаўлена арганізатарамі EdCamp Belarus—2019.

«ЛІСТАПАД» ПАКАЗВАЕ БЕЛАРУСКІЯ ФІЛЬМЫ

І НАЗЫВАЕ ПЕРШЫХ ПЕРАМОЖЦАЎ

Ад цырымоніі адкрыцця Мінскага міжнароднага кінафестывалю да першых вынікаў прайшло некалькі дзён. Яшчэ, здавалася б, учора ў кінатэатры «Масква» мы глядзелі фільм «Бацька», што сведчыў аб пачатку «Лістапада», а ўжо сёння ведаем пераможцаў Конкурсу нацыянальных кінашкол і Конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік». Праўда, не ўзнагародамі адзінымі: у фестывальныя дні ў сталічных кінатэатрах адбываецца багата, скажам так, важных падзей і сустрэч, некаторыя з якіх датычацца новых беларускіх фільмаў. Ад уласна цырыманіялу да кінаадкрыццяў — у нашых першых уражаннях.

Кадр з фільма «II».

Звычайна высокае мастацтва кіно на «Лістападзе» атачалі афіцыёзныя і нязграбна квяцістыя цырымоніі адкрыцця і закрыцця. Пачатак 26-га кінафестывалю прадэманстраваў заўважна большае падладжванне пад кінападборку: экран хутка прадставіў конкурсныя праграмы і журы, ганаровы старшыня форуму Генадзь Давыдзька разбіў аб штатыў кінакамеры талерку, і без звычайнага перапынку зала пачала глядзець фільм адкрыцця.

За першыя дні кінафестывалю адбылося некалькі важных рэчаў. Адназначна найпрыемнейшым было разуменне, што галоўнай падзеяй і ўражаннем першага дня конкурсных паказаў стаў сеанс фільма «Стрыптыз і вайна» беларускага дакументаліста Андрэя Куцілы. Пра яго гаварылі даўно, трэба сказаць, што і мы неаднаразова згадвалі «Стрыптыз» як адзін з найцікавейшых беларускіх кінапраектаў апошняга часу, а цяпер на карціну толькі на маіх вачах некалькі разоў намякалася ў кантэксце «паглядзелі на «Лістападзе» некалькі фільмаў, і найлепшым аказаўся беларускі».

Нагадаю, гэта гісторыя пра сумеснае жыццё дзеда, падпалкоўніка ў адстаўцы, з унукам-стрыптызёрам. Праз іх рознасць у поглядах, памкненнях і кантэксце, нягледзячы на якую яны ўсё роўна застаюцца блізкімі людзьмі, мы бачым, як у нашай краіне спалучаецца савецкае мінулае і XXI стагоддзе. Як мы ўжо пісалі, летась карціна не была ўключана ў Нацыянальны конкурс, затое праз год стаў магчымы не толькі паказ у рамках «Лістапада», але і ўдзел у яго Асноўным конкурсе дакументальнага кіно. Варта таксама адзначыць, што яшчэ адна работа Андрэя Куцілы — лаўрэат найпрэстыжнейшага ў сферы дакументальнага кіно фестывалю IDFA ў Амстэрдаме — сёлета ўдзельнічае ў Нацыянальным конкурсе.

Хутка, зноў жа ў Асноўным конкурсе дакументальнага кіно, адбылася, можна сказаць, нацыянальная прэм'ера новага фільма аднаго з самых славутых беларускіх дакументалістаў Віктара Аслюка: «Абход», што расказвае аб працы вясковага ўчастковага міліцыянера Аляксандра Клямята, сабраў поўную залу. Наколькі мы ведаем, умовы для здымак складваліся не найлепшым чынам: напрыклад, часу на работу з героем у рэжысёра было менш за тыдзень. Тым не менш праз Аляксандра можна ўбачыць нейкую частку, канешне, не самую прывабную, беларускай вёскі, і гэта можа выглядаць як забаўна, так і страшна. У абходзе ўчастковы наведвае, скажам так, сацыяльна неўладкаваных людзей, але праяўляе пры гэтым амаль што бацькоўскі патранаж — можа дыдактычна палаяцца, паспрабаваць наставіць на розум, папужаць пратаколам. А часам праяўляе эмоцыі і павышае голас: «Саша-Саша, я табе не Саша, я з табой гарэлку не піў». Аляксандр Клямята таксама прыехаў на прэм'еру і на прамое пытанне рэжысёра сказаў, што фільм яму спадабаўся.

Нарэшце, падзеяй стаў першы ў Беларусі паказ ігравой карціны Улады Сяньковай «II», што значыць «два», альбо дзве палоскі. Яе сусветная прэм'ера не так даўно прайшла на Варшаўскім кінафестывалі, больш за тое — кажуць, гэта першы беларускі фільм, уключаны ў яго конкурсную праграму. У гісторыі пра дзесяцікласнікаў — тэма заражэння ВІЧ, гомасексуалізм і, галоўнае, пэўнае стаўленне грамадства да гэтага. Карціна паказвае, як людзі могуць быць крыўдна непадрыхтаванымі да такіх сустрэч і якімі непрыгожымі яны ў сваіх прадузятасці і нецярпімасці становяцца. Тое, як у герояў фільма праяўляюцца забабоны і страхі, становіцца галоўным эмацыянальным момантам фільма, але сваім фіналам карціна ўсё яшчэ шле гледачам важны меседж: жыццё, нягледзячы ні на што, працягваецца, таму варта запланаваць наступны паход у кіно.

Пераможцы асноўных конкурсных праграм Мінскага міжнароднага кінафестывалю будуць названыя 8 лістапада на цырымоніі закрыцця ў кінатэатры «Масква».

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

❍ Тым часам

«Лістапад» падвёў свае першыя вынікі. У Конкурсе нацыянальных кінашкол прыз «За найлепшы фільм» атрымала «Планета Гелніца» Паўлы Райселавай з Акадэміі выканальніцкіх мастацтваў у Браціславе. Дыплом «За выдатнае ўзаемадзеянне руху камеры і мантажу» — «На сувязі» Аляксандры Мачэйчык з Польскай нацыянальнай школы кіно, тэлебачання і тэатра ў Лодзі. Дыплом «Фільм з самым крэатыўным рашэннем для аповеду гісторыі» — «Тэрыкон» Бронтэ Стал з Мабільнай кінашколы DocNomads. Нарэшце, дыплом «За самую дакладную рэжысуру» — «Інжынер Фёдаравіч» Алены Мурганавай са Школы дакументальнага кіно і тэатра Марыны Разбежкінай і Міхаіла Угарава.

У конкурсе фільмаў для дзяцей і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік» перамагла карціна «Маё неверагоднае лета з Тэс» (Нідэрланды, Германія, рэжысёр Стывен Ваўтэрлод).

Спецыяльны прыз журы, у якое ўваходзілі рэжысёр і сцэнарыст Улада Сянькова (Беларусь), пісьменнік, рэжысёр тэатра і кіно Томас Хайнеман (Германія) і прафесар кіназнаўства, заснавальніца кампаніі па стварэнні дзіцячых фільмаў Клара Суарэс (Аргенціна), прысуджаны стужцы індыйскага рэжысёра Рыма Даса «Булбул можа спяваць». За найлепшую дзіцячую ролю адзначылі Эмілі Б'ер («Калонія», Канада), а найлепшай работай дарослага акцёра ў дзіцячым фільме суддзі назвалі ролю Соні ван Утэрэна («Маё неверагоднае лета з Тэс»).

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гродненская обувная фабрика «Неман» 10 декабря 2019 года

Вид аукциона (открытый)	**Лот № 1**
